Алег Трусаў

# Падсумаванне

*Артыкулы. Спіс публікацый.*

Менск 2004

Трусаў А. А.

Падсумаванне: Навуковыя і навукова-папулярныя артыкулы 2004 года. Спіс навуковых і вучэбна-метадычных работ, науковых і навукова-папулярных публікацый дацэнта кафедры гісторыі і музеязнаўства, кандыдата гістарычных навук Трусава Алега Анатолевіча за 1976-2004 гады — Мн 72 с. Размножана на правах рукапісу.

© А. Трусаў, 2004.

## Навуковец і грамадска-палітычны дзеяч

Адным з кірункаў маёй навуковай дзейнасці з'яўляецца напісанне навуковых біяграфій, біяграм, што друкуюцца ў „Беларускай гістарычнай энцыклапедыі”, „Энцыклапедыі гісторыі Беларусі”, „Славутых імёнах Бацькаўшчыны” і іншых выданнях. Гэта біяграфічныя нарысы пра дзеячаў мінуўшчыны са звесткамі пра іх дзейнасць, эпоху, асобныя рысы характару і г. д.

У апошні час надараецца пісаць і пра нашых сучаснікаў з нагоды іх юбілеяў. З нагоды 50-гадовага юбілею навага сучасніка, вядомага беларускага археолага, гісторыка архітэктуры, публіцыста і грамадска-палітычнага дзеяча Алега Анатолевіча Трусава і пішу гэтыя радкі, тым больш, што быў рэцэнзентам некаторых яго выданняў.

Алег Трусаў нарадзіўся 7 жніўня 1954 г. у горадзе Мсціславе, былой сталіцы Мсціслаўскага княства, а потым Мсціслаўскага ваяводства, што, несумненна, паўплывала потым на яго захапленне гісторыяй і перш за ўсё гісторыяй Беларусі. Прабабуля і бабуля маленькага Алега вучылі яго беларускай мове (у тагачасным рускім асярддзі), перадавалі яму сямейныя і нацыянальныя традыцыі. Здольны юнак пасля заканчэння школы паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які скончыў у 1976 г.

Алег Трусаў працаваў у Беларускім рэстаўрацыйным праектным інстытуце супрацоўнікам, а з 1978 г. начальнікам археалагічнага аддзела.

Адачасова вучыўся ў аспірантуры і ў 1981 г. абараніў дысертацыю, атрымаўшы навуковую ступень кандыдата гістарычных навук. Тэма яго кандыдацкай дысертацыі „Археалагічнае вывучэнне помнікаў манументальнага дойлідства XI-XVII ст. ст. на тэрыторыі Беларусі (метадычныя даследаванні)”. У час працы ў Беларускім рэстаўрацыйным праектным інстытуце ён вывучаў помнікі манументальнага дойлідства, гісторыю матэрыяльнай культуры Беларусі XI-XVIII стагоддзяў, гісторыю будаўнічай тэхнікі, эвалюцыю асноўных тыпаў муровак і будаўнічых мтэрыялаў XI-XVIII ст. ст.

Як у кожнага навукоўца ёсць нейкі любімы прадмет вывучэння, так і ў Алега Трусава такім любімым аб'ектам з'яўляецца кафля. Алег Трусаў праводзіў раскопкі старажытных замкаў у Горадні, Заслаўі, Крэве, Лідзе, Мазыры, Міры, а таксама Барысаглебскай царквы ў Наваградку, Благавешчанскай царквы ў Віцебску, Каложскай царквы ў Горадні, Магілёўскай ратушы, помнікаў архітэктуры Мсціслава XVII-XVIII ст.ст. і іншых. Алег Анатолевіч Трусаў распрацаваў методыку архітэктурна-археалагічнага вывучэння манументальных помнікаў

Беларусі XI-XVIII ст.ст. Па гэтай тэматыцы было зроблена шмат публікацый, часткова ў сааўтарстве. Найбольш значныя з гэтых публікацый-80-х — 90-х гадах мінулага стагоддзя: „Помнікі старажытнага Мсціслава” Мінск, 1985 (разам з Р. В. Баравым); „Памятники монументального зодчества Белоруссии XI-XVII вв: Архитектурно-археологический анализ.” Мн., 1988; „Беларуская кафля” Мн., 1989 (аўтары – В. Е. Собаль, М. А. Ткачоў, А.А. Трусаў і У. В. Угрыновіч); „Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму” Мн., 1990; „Старадаўніх муроў адраджэнне: мінулае і сучаснасць Лідскага замка” Мн., 1990 „Старажытны Мсціслаў” Мн., 1992 (у сааўтарстве з М.А. Ткачовым); „Стары замак у Гродне XI-XVIII ст. ст.” Мн., 1993 (разам з В. Е. Собалем і Н. І. Здановіч); „Беларускае кафлярства” Мн., 1993; „Беларуская паліваная кераміка XI-XVIII ст. ст.” (сумесна з Н. І. Здановіч); „Матэрыяльная культура Міра і Мірскага замка” Мн., 1994 (у сааўтарстве з Н. І. Здановіч і А. А. Краўцэвічам). У 2001 г. Алег Анатолевіч Трусаў апублікаваў манаграфію „Манументальнае дойлідства Беларусі XI-XVIII ст.ст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі” Мн., 2001.

Алег Трусаў быў адным з пачынальнікаў беларускага нацыянальнага грамадска-палітычнага адраджэнцкага руху другой паловы 80-х гадоў XX стагоддзя. 19 кастрычніка 1988 г. на сходзе беларускіх патрыётаў-адраджэнцаў ён быў абраны ў склад аргкамітэту Беларускага Народнага Фронту „Адраджэнне”, а ў чэрвені 1989 г. на ўстаноўчым з'ездзе БНФ у Вільні ў склад Сойму БНФ.

З гэтага часу пачынаецца і актыўная палітычная дзейнасць Алега Трусава. На пачатку 1990 г. А. Трусаў у Менску быў абраны

дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання. У сакавіку 1990 г. ён быў адным з каардынатараў дэпутацкай групы „Дэмакратычная плынь” у Вярхоўным Савеце, а потым увайшоў у склад апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі на чале з Зянонам Пазьняком, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы законапраектаў, накіраваных на устанаўленне незалежнасці Беларусі, падтрымкі і абароны беларускай культуры і інш. Сваю дэпутацкую дзейнасць Алег Анатолевіч Трусаў працягваў да 1996 г. У гэты час ён быў адным з удзельнікаў падрыхтоўкі і паправак да тэксту Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 1990 г., настойваючы разам з апазіцыяй БНФ на выкрэсліванне ўпамінання ў Дэкларацыі пра „Саюз суверэнных сацыялістычных дзяржаў”, у якім знаходзілася б Беларусь. Быў вельмі чынным пры абвяшчэнні незалежнасці Беларусі у 1991 г.

У гэты ж перыяд (1991-1996 гг.) Алег Трусаў быў абраны намеснікам старшыні камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па

адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны (старшынём камісіі быў абраны дэпутат Ніл Гілевіч). На гэтай сваёй пасадзе А. Трусаў шмат зрабіў для развіцця названых кірункаў адраджэння беларускасці.

Менавіта Алег Анатолевіч займаўся справай прыняцця новага дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь — старажытнай беларуска-літоўскай Пагоні, вёў перамовы з дэлегацыяй літоўскага сойму аб адрозненнях выявы беларускай Пагоні і Літоўскага Віцісу, нават збіраў нарады па прыняцці новай вайсковай і міліцэйскай формы замест савецкай, сцягоў і г.д. Асноўным жа яго заняткам была падрыхтоўка законаў у галіне адукацыі, культуры, музейнай справы і інш. Не заседжваўся ў кабінеце, часта сустракаўся з выбаршчыкамі, распавядаў пра заканадаўчую дзейнасць.

Разам з законатворнай дзейнасцю Алег Трусаў працягваў і палітычную. Ён быў адным са стваральнікаў новай палітычнай партыі — Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. На ўстаноўчым з 'ездзе БСДГ А. Трусаў быў абраны намеснікам старшыні Цэнтральнай рады Грамады (старшынём быў абраны М. А. Ткачоў) Алег Анатолевіч узначаліў фракцыю Грамады ў Вярхоўным Савеце. Ён таксама застаўся ў грамадска-палітычным аб'яднанні Беларускага народнага фронту „Адраджэнне”. Падчас прэзідэнцкіх выбараў 1994 г. фракцыя Грамады падтрымлівала дэмакратычных кандыдатаў у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Пасля смерці М. А. Ткачова на 2-м з 'ездзе БСДГ Алег Трусаў быў абраны старашынём БСДГ. Гэтую пасаду займаў да 1995 г.

Стварэнне новай партыі Беларуская сацыял-дэм. партыя (Народная грамада) ён не падтрымаў і прыклаў свае намаганні для захавання старой партыі БСДГ. У 1998 г. пры ўтварэнні (аднаўленні) партыі — Беларуская Сацыял-Дэмакратычная Грамада, якая вылучылася з Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай партыі, быў актыўным удзельнікам аднаўленчых працэсаў. На выбарах у 1998 г. у кіраўніцтва БСДГ быў абраны намеснікам старшыні Цэнтральнай Рады Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады (старшынём быў абраны С. С. Шушкевіч). На пасадзе намесніка старшыні Грамады знаходзіўся да красавіка 1999 г., калі быў абраны старшынем Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. На гэтай пасадзе плённа працуе і цяпер.

Алег Анатолевіч Трусаў займаецца і педагагічнай дзейнасцю. Ад 1995 г. працуе дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, у 1996-1998 гг. займаў пасаду дэкана факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, з 1998 г. — дацэнт каферды гісторыі Беларусі

і музеязнаўства. Перадае свае веды студэнтам музеязнаўчай спецыялізацыі і іншых спецыяльнасцяў.

Аднак большую частку свайго часу Алег Трусаў удзяляе грамадскай і палітычнай працы. Ён па-ранейшаму ў гушчыні палітычных падзей, па-ранейшаму знаходзіцца ў першых шэрагах абаронцаў незалежнасці Беларусі, але найбольш сілы прыкладае ў дзейнасці Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Яно дзейнічае вельмі актыўна ў апошнія гады ў розных кірунках — праваабарончым, прапагандысцкім, асветніцкім, грамадска-палітычным. Рэгулярна выходзяць газеты „Наша слова” і „Новы Час”, праводзяцца семінары на гістарычныя і мовазнаўчыя тэмы вядзецца работа па кантакту з дзяржаўнымі арганізацыямі.

50 год — гэта для грамадскага дзеяча і палітыка час росквіту ў Алега Анатолевіча Трусава яшчэ шмат здзяйсненняў і мэтаў наперадзе.

Яго палітычны і жыццёвы досвед, актыўнасць і метанакіраванасць даюць яму магчымасць у бліжэйшай будучыні займаць высокія і нават самыя высокія пасады ў нашай краіне.

*Анатоль Грыцкевіч, загадчык*
*кафедры гісторыі Беларусі і*
*музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага*
*універсітэта культуры, сябар Рады ТБМ*
*імя Ф. Скарыны.*

## Тры глыткі маёй свабоды

На ўсё жыццё ўвайшоў у маю памяць і сэрца дзень 25 жніўня 1991 года.

За спіною тры напружаныя жнівеньскія дні, калі мы, дэпутаты парламенцкай апазіцыі на платформе БНФ, працавалі літаральна дзень і ноч, каб Беларусь набыла незалежнасць, што і сталася фактам 25 жніўня.

Ліквідавана КПБ і апячатана яе маёмасць. У залу Вярхоўнага Савета быў унесены бела-чырвона-белы сцяг як сведчанне новай эпохі.

Вечарам 25 жніўня мне давялося адзначыць за кілішкам каньяку разам з касманаўтам Уладзімірам Кавалёнкам нашу свабоду. Гэта быў першы дзень у маім жыцці, калі я адчуў сябе ўдзельнікам гістарычнага працэсу і добра зразумеў, што перажывалі тыя людзі, якія 25 сакавіка 1918 года абвесцілі БНР. Я стаў сапраўды вольным чалавекам, які прымае непасрэдны ўдзел у пабудове незалежнай краіны.

*Гэта быў мой першы глыток свабоды.*

Праз некалькі дзён я разам з іншымі дэпутатамі ад апазіцыі быў камандзіраваны Вярхоўным Саветам у Маскву на апошні з'езд дэпутатаў СССР, сабраны ўжо пасля паразы жнівеньскага закалоту.

Цёплы, амаль летні дзень. Пачатак верасня. Масква. Крэмль, 1991 год. Мы з Зянонам Пазьняком, чакаючы пачатку сесіі, ходзім па Крамлёўскім двары і аглядаем старыя гарматы, што з'яўляюцца часткай своеасаблівай экспазіцыі. І вось бачым некалькі нашых беларускіх гармат 18 ст. Як яны трапілі сюды?

Магчыма, падчас Паўночнай вайны, а можа, яны сведкі паўстання Касцюшкі? Тады, у канцы 18 ст., усходняя імперыя ў сваім няспынным руху на Захад паглынула Беларусь і пайшла далей, на Варшаву. Здавалася, што гэтую самую вялікую ў свеце краіну спыніць немагчыма, асабліва калі пасля 1917 г. яна трансфармавалася ў СССР і ўсяму свету пагражала камунізмам і ядзернай зброяй. Нават дабралася да Кубы і завезла туды свае ракеты. І вось усё скончылася...

Вялікая зала Палаца з'ездаў СССР у Крамлі. Прыбалтыйскія рэспублікі канчаткова сталі незалежнымі. СССР ператварыўся ў канфедэрацыю, дзе законы асобных рэспублік сталі вышэйшымі за саюзныя і мелі перавагу на сваёй тэрыторыі. Яшчэ засталіся агульнымі войска, грошы, чыгунка, пошта і шмат чаго іншага, але водар свабоды ўжо напоўніў душную залу і натхняў нас на далейшае змаганне.

Аглядаючы забудову Крамля падчас перапынкаў у паседжаннях, я разумеў, што з'яўляюся сведкам падзення „Трэцяга Рыму”, жорсткага, крывавага і ненажэрнага. Як добра, што пскоўскі манах, які прыдумаў гэтае крылатае выслоўе, скончыў яго словамі: „...А чацьвёртаму — не бываць”. І гэта святая ісціна.

*Другі глыток свабоды, пасярод крамлёўскіх муроў, быў як ніколі глыбокім і значным.*

У снежні здарыліся падзеі ў Белавежы і Алма-Аце. Беларусь прызналі ва ўсім свеце. Нацыянальная сімволіка стала дзяржаўнай, паўстала свая валюта і войска, чыгунка, і пошта, і нават, свой прэзідэнт.

Аднак на ўсходзе з'явілася настальгія па „Трэцім Рыме", пачаліся „брацкія абдымкі і пацалункі". Дэпутаты апазіцыі, каб супрацьстаяць ганебнаму рэферэндуму, накіраванаму супраць нашай сімволікі і мовы, 11 сакавіка 1995 г. абвесцілі галадоўку, і Вярхоўны Савет адмовіўся выносіць на грамадскае абмеркаванне вышэйзгаданыя пытанні. Дэмакратыя на Беларусі заставалася да ночы 12 сакавіка.

У тую ноч, калі свабоду ў Беларусі абмежавалі і закавалі ў кайданкі, падчас галадоўкі я знаходзіўся ў Авальнай зале Вярхоўнага Савета побач з Пазьняком ды іншымі дэпутатамі, каб супрацьстаяць гэтаму злачынству. Глыбокай ноччу расчыніліся ўсе дзверы, і на нас накінуліся людзі ў чорных масках, а за імі — натоўп у форме, з аўтаматамі, дубінкамі, у касках, з тварамі, закрытымі спецыяльнымі шчыткамі. Мы здолелі сарваць некалькі масак з іх твараў, і яны хуценька паляглі, бо баяліся і нас, і тых відэакамер, якія з двух бакоў здымалі начную залу Вярхоўнага Савета Беларусі, залу, дзе знішчалася і дратавалася свабода ўсяго беларускага народа. І калі мяне, збітага і адарванага ад сваіх сяброў, цягнулі па падлозе, а потым кінулі ў „варанок", я па-ранейшаму адчуваў сябе вольным чалавекам і не баяўся нападнікаў, бо свабоду, хай сабе і ў зняволенага чалавека, які яе ўдыхае на поўныя грудзі, можна забраць толькі разам з жыццём.

Таму ў мяне назаўтра не было ніякай крыўды на тых, хто здзяйсняў гэты напад. Я дараваў ім іхнія правіны, па хрысціянку, шчыра. Бо як сказана ў Святым пісанні, „яны не ведаюць, што твораць". Дарэчы, потым адзін з нападнікаў прасіў у мяне прабачэнне.

*Трэці глыток свабоды быў балючым, але неабходным, бо за свабоду заўжды трэба змагацца.*

З тае ночы прайшло дзевяць гадоў. Тры краіны — суседкі Беларусі — ўступілі ў НАТА. Масква перакрыла Беларусі газ і тым самым значна ўмацавала нашу незалежнасць. Зноў пачалі выходзіць забароненыя раней беларускамоўныя газеты. Шмат якія палітыкі свету, у тым ліку і Вацлаў Гавел, выступілі з падтрымкай незалежнай, вольнай Беларусі.

Я трымаю ў руках першы нумар чарговы раз аднооўленай газеты „Свабода", слухаю беларускае радыё „Свабода" і дакладна ведаю, што неўзабаве мы канчаткова вернемся ў вольны еўрапейскі свет, і кожны грамадзянін Беларусі канчаткова зразумее вартасць і непераможнасць гэтага салодкага слова — Свабода.

## Лінгвістычны тэрарызм у Беларусі ў XX стагоддзі

Сярод шматлікіх праяў тэрарызму ў свеце і асабліва ва Усходняй Еўропе, асобна можна выдзеліць мову тэрарыстаў і іх памагатых. Як правіла, іх мова вельмі неахайная, з выкарыстаннем крымінальнага жаргону і ненарматыўнай лексікі. Гэта робіцца невыпадкова, з мэтай запалохаць і прынізіць простага чалавека, каб ён бяздумна выконваў усе іх загады і патрабаванні.

Найбольш дасканала гэты прыём у XIX і асабліва ў XX стагоддзі праяўляўся ў прадстаўнікоў дзяржаўнага тэрарызму, калі палітыка тэрору, вытокі якой заклала Французская рэвалюцыя XVIII ст, стала ідэалогіяй розных еўрапейскіх краін.

На тэрыторыі Беларусі прадстаўнікі дзяржаўнага і індывідуальнага тэрору актыўна выкарыстоўвалі ў сваіх мэтах рускую мову ў яе канцылярска-крымінальным варыянце. Прывяду некалькі прыкладаў.

Пад час задушэння народнага паўстання 1863-1864 года, царскія карнікі прымушалі захопленых паўстанцаў даваць паказанні толькі па-руску, нягледзячы на тое, што іх роднымі мовамі былі беларуская ці польская. Кіраўнік карнікаў губернатар Мураўёў адзначаў, што тое, што не зрабіў рускі штых, зробіць рускі настаўнік. З сярэдзіны XIX ст. да рэвалюцыі 1905 г. беларуская мова на Беларусі была забаронена і пастаўлена за межы закона.

Традыцыі графа Мураўёва творча запазычылі бальшавікі, якія займаліся спачатку індывідуальным, як, напрыклад, Сталін ці Катоўскі, а потым і дзяржаўным тэрорам. Давайце ўспомнім „чырвоны тэрор” 1918-1919 гадоў.

Цікава, што ў бальшавіцкім кіраўніцтве этнічна рускіх людзей было няшмат, але ўсе бальшавікі аднадушна выбралі мовай тэрору рускую мову ў яе самым найгоршым варыянце і нават зрабілі моўную рэформу па яе спрашчэнні і вульгарызацыі. Найбольш вылучаліся ў гэтым сэнсе тыя бальшавікі, што дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі. Не будучы рускімі па паходжанні, Мяснікоў (Мяснікян), Ландэр, Берсан, Кнорын (Кнорыньш), Алібегаў (Алібегянц) і іншыя не прызнавалі беларусаў як нацыю і беларускую мову як дзяржаўную.

Актыўна выкарыстоўвалі рускую мову з мэтамі моўнага тэрору карныя савецкія органы пачынаючы з Дзяржынскага. Арыштаваных беларускіх пісьменнікаў, настаўнікаў, палітыкаў, рабочых і сялян прымушалі шляхам розных катаванняў „говорить на нормальном языке”. Пачынаючы з 30-х гадоў XX ст., чалавек, які на вуліцы ці ў нейкай дзяржаўнай установе гаварыў на добрай літаратурнай бела-

рускай мове, лічыўся „нацыяналістам” і мог быць арыштаваны па моўнай прыкмеце.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі, якую ў 1921 годзе бальшавікі падарылі Польшчы, з мэтай узмацнення дзяржаўнага тэрарызму выкарыстоўвалася польская мова. Людзей, асабліва пісьменнікаў і журналістаў, а таксама простых беларускіх сялян польскія паліцэйскія збівалі за выкарыстанне роднай мовы. У школах, дзе выкладанне вялося па-польску, беларускім дзецям забаранялі размаўляць па-беларуску нават на перапынках. Гэта выклікала абурэнне і акты камуністычнага тэрору ў адказ. Напрыклад, добра вядомая справа Прытыцкага, якая гучна асвятлялася ў тагачаснай прэсе.

Апалагетам моўнага тэрору на тэрыторыі БССР пасля апошняй вайны стаў Мікіта Хрушчоў, які на ганку БДУ заявіў, што беларусы, калі пяройдуць на рускую мову, адразу стануць жыць пры камунізме.

Даўно ўжо няма СССР, распалася камуністычна-савецкая ідэалогія, але рэцыдывы моўнага тэрарызму ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь засталіся.

Напрыклад, у беларускіх судах нярэдка ёсць факты, калі суддзі адмаўляліся весці працэс на беларускай мове і прымушалі размаўляць па-руску ўсіх удзельнікаў судовага працэсу. Асабліва ад гэтага церпяць цыганы, якім ніколі не даюць перакладчыка.

Кіраўніцтва Беларусбанка патрабуе ад кліентаў запаўняць анкеты для атрымання пластыкавых картак толькі па-руску. У рускамоўных школах дзецям забараняюць нават запаўняць дзённікі на роднай мове. Як тут не прыгадаць заходнебеларускую школу часоў Пілсудскага! Няўжо гэта магчыма ў незалежнай Беларусі?

Усе вышэйзгаданыя факты могуць прывесці да расколу беларускага грамадства і з'явіцца глебай для індывідуальнага тэрарызму на моўнай глебе. Гэта добра разумеюць грамадзяне нашай краіны, якія неаднаразова звярталіся ў Канстытуцыйны Суд па вышэйназванай праблеме.

У снежні 2003 г. Канстытуцыйны Суд прыняў рашэнне, у якім адзначалася парушэнне дзейнай Канстытуцыі краіны ў сферы роўнасці двух дзяржаўных моў. Цяпер неабходна як мага хутчэй унесці адпаведныя папраўкі ў Закон „Аб мовах”, каб выкараніць на заканадаўчым узроўні моўную дыскрымінацыю грамадзян Беларусі ва ўсіх сферах грамадскага і асабістага жыцця.

## Незалежная беларуская дзяржава вачыма Янкі Купалы

*У ліпені гэтага года споўнілася 14 год, як Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб незалежнасці Беларусі. Менавіта з гэтага палітычнага кроку Беларусь пачала новы адлік свайго існавання, які ў снежні 1991 года дазволіў ёй, і дэ-юрэ і дэ-факта, цалкам аднавіць сваю незалежнасць.*

Вядома, гэта не ўсім падабалася і ўжо праз некалькі год з'явілася розныя, асабліва рускамоўныя, „дэмакраты", якія пачалі сцвярджаць і зараз сцвярджаюць, што беларусу незалежнасць звалілася ў рукі раптоўна „як снег на галаву". Нядаўна адна такая „дэмакратка", што часам прылічвае сябе да „канструктыўнай" апазіцыі, дагаварылася на старонках незалежнай прэсы, што незалежнасць звалілася на беларусаў, „як цагліна на галаву". Як кажуць, далей ужо няма куды ні ісці, ні ехаць!

Гаму вельмі своечасова прыгадаць нашых класікаў, ідэолагаў стварэння і існавання беларускай нацыянальнай ідэі і канцэпцыі беларускай незалежнай дзяржавы.

Адным з ідэолагаў гэтай канцэпцыі быў і да канца дзён сваіх заставаўся наш славуты паэт Янка Купала. Фармальна ён ніколі не належаў ні да якіх партый, але ўжо з маладых гадоў добра ведаў беларускіх грамадоўцаў. У адным з сваіх лістоў у 1928 годзе ён піша, што ў 1904-1905 гадах пазнаёміўся з Уладзімірам Самойлам і Алесем Бурбісам, якія давалі яму нелегальную літаратуру для распаўсюджвання. Дарэчы, Уладзімір Самойла быў рэпетытарам, гэта значыць, настаўнікам Янкі Купалы.

Невыпадкова, што гэтыя знакамітыя людзі і паспрыялі палітычнай арыентацыі паэта на стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы. Дзякуючы спрыянню Самойлы, у 1905 годзе ў газеце „Северо-Западный край" быў ўпершыню надрукаваны верш Купалы „Мужык", прычым на беларускай мове. Назва газеты адпавядала тагачаснай назве нашай краіны, прыдуманай царскім рэжымам, які забараніў ужыванне назвы „Беларусь" яшчэ ў 1840 годзе. З 1918 года Самойла жыве ў Вільні, дзе ў 1923-27 гадах лічыцца адным з вядучых публіцыстаў заходнебеларускага перыядычнага друку, які выкрываў каланіяльную палітыку тагачасных польскіх уладаў.

Выдатным палітычным дзеячом Беларусі быў і Алесь Бурбіс. Гэта адзін з заснавальнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады, які быў сябрам ЦК БСГ у 1903-1905 гадах. У 1917 годзе ён узначаліў Маскоўскую арганізацыю Грамады, а ў 1918 годзе стаў консулам Беларускай Народнай Рэспублікі ў Маскве. У пачатку 1918 года Бурбіс вітае

стварэнне БССР і становіцца з ліпеня 1921 года намеснікам Наркама замежных спраў.

Такім чынам, у 1928 годзе Купала прыгадаў імёны, як савецкага, так і заходнебеларускага дзеячоў і засведчыў свой глыбокі палітычны досвед.

Значную ролю ў набыцці агульнай адукацыі Купалам, у тым ліку і палітычнай, адыграў яго старэйшы сябра і фундатар Баніслаў Эпімах-Шыпіла.

Пасля таго, як Купала шмат год папрацаваў у „Нашай Ніве”, яго палітычныя погляды на існаванне незалежнай беларускай дзяржавы канчаткова склаліся. У 1913 годзе ў артыкуле „Чаму плача песня наша?” Купала піша наступнае: „Астаецца нам толькі адна вера ў тое, што не за гарамі ўжо той час, калі ўзбудзіцца наш беларускі народ, як адзін, к новаму, светламу жыццю...” У гэтым жа годзе ў другім артыкуле пад назовам „Як яны ваююць” паэт сцвярджае „...па ўсёй старонцы будзіцца просты народ, растуць сілы дэмакратыі, і яна бярэ ў свае моцныя рукі кіраванне краем, ды мо і не выпусціце”.

У 1914 годзе Купала піша надзвычай важны артыкул „Ці маем мы права выракацца роднай мовы?”, які і зараз не згубіў сваёй актуальнасці. У ім знакаміты паэт не сумняваецца ў існаванні раней сваёй дзяржавы ў беларусаў. Ён піша: „Некалькі соцень лет таму назад, калі Беларусь жыла сваім незалежным жыццём, мела сваіх князёў, свае веча, ці маглі беларусы іначай гаварыць, як не па-беларуску?”. У сваіх артыкулах Купала часта называе Вялікае Княства Літоўскае „Літоўска-беларускім княжаствам”, чым сведчыць пра непарыўнасць беларускай дзяржаўнай традыцыі. У гэтым жа годзе паэт у матэрыяле „А ўсё ж такі мы жывём” гаворыць пра прадумовы будучай незалежнай краіны наступнае: „Калі зірнем на тое, што за некалькі год зроблена намі, беларусамі, над падняццем свайго нацыянальнага багацтва, то адно толькі душа можа радавацца. У некалькі год мы зрабілі тое, што ў палякаў і расейцаў рабілася чуць не цэлымі сталеццямі”.

Найбольш вызначыўся Купала як ідэолаг беларускай незалежнасці ў 1919 і 1920 гадах.

Асноўныя моманты купалаўскай канцэпцыі незалежнай Беларусі добра паказаў знаны беларускі навуковец Вячаслаў Рагойша ў прадмове да зборніка вершаў і артыкулаў Янкі Купалы пад назовам „Жыве Беларусь”. Нельга не пагадзіцца з даследчыкам, што стрыжнёвая ідэя канцэпцыі незалежнай Беларусі ў Купалы заключаецца ў тым, што ў вольнай краіне „усе роўныя перад правам і законам” і што „кожны грамадзянін нашага краю павінен карыстацца з роўнай пашаны, з

роўнай абароны ў вачах права свету". Марай паэта была думка, што „у вольнай незалежнай беларускай дзяржаве не павінна быць ні „эліна, ні іудзея".

Балючай тэмай тады, як дарэчы і зараз, было зямельнае пытанне. Купала спадзяваўся, што сяляне атрымаюць у новай дзяржаве панскую зямлю ў свае рукі.

Пісаў паэт пра нашыя спрадвечныя сімвалы — сцяг і герб. Хваляваўся ён і пра будучы гімн Беларусі. І гэтыя хваляванні актуальныя, на жаль, і сёння. Бо і зараз адсутнічае музыка і словы, якія робяць кожнага грамадзяніна Беларусі чалавекам годным і вольным, патрыётам сваёй Радзімы.

Турбаваўся Купала пра існаванне свайго войска, без якога незалежнасць не магла адбыцца. Ён нават у 1920 годзе напісаў для беларускіх жаўнераў некалькі песняў-вершаў „на вайсковыя матывы".

Літоўска-беларускай сталіцай называў Купала Вільню і вітаў аднаўленне Віленскага універсітэта ў кастрычніку 1920 года. У артыкуле „Уваскрасенне польскага універсітэту ў Вільні" ён паведамляе, „што Вільня гэта спрэчны горад, на каторы тры дзяржавы заяўляюць свае правы — гэта Польшча, Літва і Беларусь". Зыходзячы з гэтага, ён лічыў, „што Віленскі Батораўскі Універсітэт павінен і абавязан здаволіць духоўныя патрэбы ўсіх трох народаў: палякаў, літвінаў і беларусаў".

У снежні 1919 года ў газеце „Беларусь" выходзіць артыкул Янкі Купалы „За цэласнасць Бацькаўшчыны". У 1918 годзе Купала жыў у Смаленску і непасрэднага ўдзелу ў стварэнні БНР не браў. Таму шмат год яго адносіны да падзей 25 сакавіка 1918 года замоўчваліся і зводзіліся да падтрымкі паэтам існавання БССР. Але лепей хай сам Купала скажа пра гэтыя падзеі: „Беларусь вуснамі Усебеларускага з'езду 1917 г. і Рады Рэспублікі абвясціла сябе незалежнай дзяржавай і як такая выступіць на міжнародную арэну. І як на такую глядзіць на яе ўсенькі свет. Беларуская дэлегацыя ў Парыжы прынімаецца выразна, як дэлегацыя Ураду Беларускай Народнай Рэспублікі". „І толькі ідэя Беларускай дзяржавы, у каторай беларускі народ быў бы гаспадаром, можа крэпка звязаць абедзве рэлігійныя групы — каталікоў і праваслаўных, бо і адным і другім дзяржаўная незалежнасць Бацькаўшчыны дае больш волі і шчасця".

Як сапраўдны палітолаг Янка Купала выступае ў артыкуле „Справы незалежнасці Беларусі за мінулы год", які быў напісаны ў 1920 годзе. Ён вызначае дзве супрацьлеглыя сілы, што з'явіліся ў выніку першай сусветнай вайны і расійскай рэвалюцыі. Гэта рэвалюцыя нацыянальная і рэвалюцыя сацыяльная. Прыхільнікі сацыяльнай

рэвалюцыі, расійскія бальшавікі імкнуцца знішчыць нацыянальныя перагародкі і злучыць пад чырвоным сцягам усе народы свету. Нацыянальная рэвалюцыя паставіла сабе на мэту вызваленне ўсіх нацый, што былі падняволеныя моцнымі дзяржавамі. Далей Купала трапна разважае, што гэтыя рэвалюцыі найяскравей праявілі свае адмоўныя і станоўчыя рысы менавіта на беларускай зямлі.

У сакавіку 1921 года Польшча і Расія падзялілі Беларусь, а Купала застаўся ў Менску, на савецкім баку. У гэты жахлівы час паэт піша верш „Перад будучыняй", які потым яму не раз прыпомняць ворагі беларушчыны. Бо менавіта пра іх пісаў — народны песняр:

А хтось далёкі ці хтось, можа, блізкі
Засеў за наш бяседны, сытны стол
І кідае, як з ласкі, нам агрызкі,
А мы к зямлі з падзякай гнёмся ў пол.

Пазней, падчас допыту ў НКУС, 15 лістапада 1930 года пра матывы, што леглі ў аснову гэтага верша, Купала паведаміць, што „нацыяналістычная афарбоўка" верша выклікана тым, што тэрыторыя БССР у той час складала толькі шэсць паветаў былой Менскай губерні. Гэтаму настрою спрыялі і зневажальныя адносіны да беларускай мовы і беларусізацыі.

У гэты час Купала піша і сваю знакамітую п'есу „Тутэйшыя", якая вельмі не спадабалася бальшавікам і якую амаль адразу забаранілі. Аднак напісанае застаецца. У часы гарбачоўскай перабудовы ў 1989 годзе ў выдавецтве „Мастацкая літаратура" выходзіць гэты геніяльны твор класіка беларускай літаратуры. У паслямове да гэтага выдання Віктар Каваленка адзначыў, што „твор застаецца надзвычай актуальным і ў сучаснай сітуацыі грамадскага развіцця". Гэтыя словы не згубілі свайго сэнсу і зараз. Найбольш трапную характарыстыку „Тутэйшым" з палітычнага гледзішча даў Ніл Гілевіч, ён лічыць, што вуснамі свайго героя Янкі Здольніка „Купала выкладае ў сканцэтраваным выглядзе і сутнасць беларускай нацыянальнай ідэі, і асновы нацыянальнай палітыцы БНР, палітыкі, якую ён хацеў бы бачыць ажыццёўленай ў Беларусі".

У 1925 годзе святкавалі 25 год літаратурнай дзейнасці Купалы. У сваім звароце да грамадзян з гэтай нагоды Купала вылучае наступны лозунг: „Няхай жыве незалежная Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка ў сваіх этнаграфічных межах!" Такім чынам, і ў савецкія часы паэт не змяніў сваіх поглядаў на змест незалежніцкай ідэалогіі, змяніўшы толькі яе форму.

Неўзабаве надышлі часы сталінскіх рэпрэсій і ў 1930 годзе Купала вырашыў добраахвотна развітацца з жыццём, бо лічыў, што „лепей

смерць фізічная, чымся незаслужаная смерць палітычная”. Аднак медыкі захавалі паэту жыццё, і ён мусіў падпісаць адкрыты ліст да грамадскасці. Дарэчы, у ім Купала называе сябе „адным з ідэолагаў буржуазна-дэмакратычнага „адраджэнства” і „незалежніцтва”. Не адмаўляе ён і сваёй ролі ў беларусізацыі, што разгарнулася ў краіне ў другой палове 20-х гадоў мінулага стагоддзя.

25 траўня 1930 года адзначалі 30 год літаратурна-мастацкай дзейнасці Янкі Купалы. У сувязі з гэтым рэдактарам усіх газет быў разасланы сакрэтны дакумент з ЦК КП(б)Б, у якім другі перыяд творчасці паэта, звязаны з „Нашай Нівай”, азначаецца як яго пераход на пазіцыі буржуазнага лібералізму і культрэгерства. „Гэты перыяд падрыхтоўвае трэці этап яго развіцця, калі ў яго творчасці гучаць поўным гукам буржуазна-рэакцыйныя і адраджэнскія, нацыянальна-дэмакратычныя настроі”.

Такім чынам, кола замкнулася. Ужо ў 1930 годзе Купала стаў агульнапрызнаным ідэолагам пабудовы новай незалежнай беларускай дзяржавы. Аднак на гэтым справа не спынілася. У 1932 годзе на пасяджэнні бюро ЦК КП(б)Б, дзе разглядалася пытанне аб стане літаратурнага фронту ў БССР, тагачасны другі сакратар ЦК Васіль Шаранговіч сцвярджаў, што Купала не стаў нашым і вядзе супроць бальшавікоў варожую працу. Ён лічыў паэта разумным і хітрым чалавекам, у якога шмат сяброў. Да Шаранговіча далучыўся і сакратар ЦК Вацлаў Жаброўскі. Ён сказаў, што лепшыя творы Янкі Купалы накіраваны несумненна супроць бальшавікоў, а яго антысавецкія артыкулы — гэта цудоўныя артыкулы. Гэта звязана з тым, як Купала прыняў Кастрычніцкую рэвалюцыю, „водворение” савецкай улады ў БССР і г.д. Лейтматыў 5 тамоў паэта — антысавецкі, класава варожы бальшавікам”.

У сакрэтнай біяграфічнай хроніцы беларускага пісьменніка, дасланай у Маскву 28 траўня 1940 года адзначаецца, што контррэвалюцыйная дзейнасць Купалы пачынаецца з 1908 года, а пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі Янка Купала — адзін з кіраўнікоў, разам з Якубам Коласам антысавецкага нацдэмаўскага руху ў Беларусі.

Тым не менш, у студзені 1941 года вуліцу Садовую ў Менску хацелі назваць у гонар Янкі Купалы з нагоды 35-годдзя дзейнасці паэта. Купала атрымаў ордэн Леніна і быў абраны ў 1940 годзе дэпутатам ВС БССР ад Лідскай выбарчай акругі. Дзякуючы сваёй творчасці і ўсебеларускай вядомасці, Янка Купала стаў пры жыцці сімвалам Беларусі, яе паэтычным прадстаўніком і нацыянальным лідарам. Было б добра, каб да 125 годдзя з дня нараджэння паэта з'явіўся ордэн Янкі Купалы.

## Невядомыя беларускія дзяржавы

Доўгі час савецкія гісторыкі запэўнівалі беларусаў, што яны ніколі раней не мелі дзяржаўнасці, і першая ў свеце беларуская дзяржава ўтварылася ў Смаленску 1 студзеня 1919 г. Праўда, пра памеры Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, якая некалькі тыдняў існавала ў этнаграфічных межах рассялення беларусаў, стараліся не гаварыць, бо хутка абрэзалі нашу тэрыторыю больш чым на палову.

Прайшлі гады. Зараз кожны вучань ведае пра нашу першую дзяржаву — Полацкае княства, пра Вялікае Княства Літоўскае, Беларускую Народную Рэспубліку. Аднак, калі паглядзець на этнаграфічную карту Беларусі, надрукаваную ў розных рускіх, нямецкіх і іншых выданнях пачатку XX ст., можна заўважыць, што яна значна большая, чым усходнія межы ВКЛ. Цікава, як там апынуліся беларусы, як захаваліся аж да Першай сусветнай вайны са сваёй мовай, звычкамі, нават, строямі? І гэта ў той час, калі ўжо з XV ці з XVI ст. тут у асноўным існавалі маскоўскія ўлады, што мелі вялізарны досвед у асіміляцыі паняволеных народаў. Дзе зараз шматлікія фіна-ўгорскія і цюркскія плямёны: народы, якія трапілі аднчасова з часткай беларусаў у склад Масковіі ў XIV-XVI стст?

Беларусы мацней супраціўляліся асіміляцыі, бо мелі больш высокі культурны і палітычны ўзровень, бо мелі не адну, а шмат розных дзяржаваў у розныя часы. Толькі нашчадкі крывічаў, якія ўзгадваюцца ў летапісах апошні раз у XII ст, мелі ў XIV-XV ст. чатыры самастойныя дзяржавы: Вялікае Княства Літоўскае, Жамойтскае і Рускае, Вялікае Княства Смаленскае, Вялікае Княства Цвярское і Пскоўскую Рэспубліку. Гэтыя дзяржаўныя ўтварэнні хоць часам і варагавалі паміж сабой, вельмі часта выступалі разам супроць ворагаў: крыжакоў, татараў, а потым і супроць Масковіі, якая паступова набірала моц і магутнасць.

## Вялікае Княства Цвярское

Узнікла гэта краіна на землях, заселеных смаленскімі крывічамі ў XIII ст. і існавала амаль да канца XV ст.

Горад Цвер узнік у XII ст. і спачатку належаў Ноўгараду, а з 1209 перайшоў пад уладу Ўладзіміра-Суздальскага княства. Яго росквіт прыпадае на XIII-XV стст, калі ён стаў буйным культурным і рамесным цэнтрам. Цвярскія купцы гандлявалі з гарадамі Прыбалтыкі і Каўказа, Блізкага Ўсходу і Сярэдняй Азіі. Найбольш вядомы з іх — Афанасі Нікіцін, які ў 1466-1472 гадах стаў першым еўрапейцам, што здзейсніў вандроўку ў Індыю. Гэта быў адукаваны чалавек, валодаў арабскай, татарскай і персідскай мовай. Спачатку па Волзе ён дабраўся да г. Дзербента, потым пераехаў у Баку і Песію. З Персіі трапіў у арабскі порт Армуз, а потым па моры дабраўся да Індыі. Назад ён вяртаўся праз Персію і горад Трапезунд — порт на Чорным моры. Пераплыўшы праз Чорнае мора, высадзіўся ў Крыме ў горадзе Кафа (зараз Феадосія). Перадолеўшы доўгі шлях з Крыма, ён крыху не даехаў да дому і восенню 1472 года памёр пад Смаленскам. Шмат разоў выдаваліся яго ўспаміны „Хождение за три моря”. У 1955 годзе ў Цвяры землякі паставілі Нікіцiну помнік, зроблены з бронзы і граніту.

У пачатку XIII ст. Цвер — гэта цэнтр Пераяслаў-Залескага княства. Але пасля разгрому Уладзіміра-Суздальскай зямлі ман- гола-татарамі, атрымлівае ў 1247 незалежнасць пры князі Яраславе Яраславічы, родным браце Аляксандра Неўскага. З 1264 года ён становіцца вялікім князем Уладзімірскім. У наступным годзе ў Цвяры ўзнікае епіскапская кафедра, якую ўзначаліў былы полацкі епіскап Сімяён. Другім цвярскім епіскапам у 1289-1316 гг. быў Андрэй, сын полацкага князя Гердзеня.

Сталіца новай дзяржавы, як некалі і Полацк, не магла існаваць без мураванага сабора. І ён быў закладзены ў 1285 годзе князем Міхаілам Яраслаўічам, яго маці княгіняй Аксінняй і епіскапам Сімяёнам. Паколькі будаўніцтва храма ішло доўга, у яго сярэдзіне зрабілі часовую драўляную царкву, якая дзейнічала падчас будаўніцтва. Асвяціў храм у імя святога Спаса Праабра- жэнскага епіскап Андрэй у 1290 г.

Як бачым, нават назва храма была сугучна назве знакамітай Спаса-Праабражэнскай царквы, пабудаванай у XII ст. Ефрасінняй Полацкай. Праз два гады храм распісалі фрэскамі і ён быў кафедральным, галоўным храмам новай краіны. Неўзабаве да яго прыбудавалі два малыя храмы (прыдзелы). У адным з іх у 1323 годзе і быў пахаваны епіскап Андрэй. У 1399 г. князь Міхаіл Аляксандравіч

капітальна адрамантаваў царкву. Спаскі сабор стаў першым мураваным храмам на тэрыторыі Паўночна Усходняй Русі пасля татарскага разгрому 1238 года. Такім чынам Цвер апярэдзіла Маскву ў галіне мураванага будаўніцтва У XVII ст. царкву некалькі разоў перабудоўвалі, а ў 1935 годзе яна загінула. Храм быў зроблены з белага каменю і, магчыма быў аздоблены разьбою. У 1992 годзе на месцы храма быў знойдзены кавалак белакаменнай разьбы ў выглядзе пляцёнкі.

Яшчэ адну мураваную царкву пачалі будаваць цверцы ў 1323 годзе ў Фёдараўскім манастыры. Збудаваў храм у імя святога Фёдара ігумен манстыра Іван Цараградзец. Гэта таксама быў белакаменны храм, які знішчылі ў 1773 годзе. Падчас раскопак на месцы храма археолагі знайшлі шмат кавалкаў белакаменных блокаў (у тым ліку, адзін разны) і вялікапамернай цэглы.

У XIV ст. у Цвяры на беразе Волгі стаяў яшчэ адзін храм Міхаіла Архангела. Даследчыкі лічаць, што яго збудаваў кіраўнік цвярскога войска тысяцкі Міхаіл Шатэн і потым тут хавалі цвярскіх тысяцкіх. Аднак невядома, ці гэта быў драўляны, ці мураваны будынак.

У 1369 годзе князь Міхаіл Аляксандравіч умацаваў Цвер драўляным крамлём, а ў 1372 годзе ўзвёў вакол земляны вал. Зараз культурны слой цвярскога крамля мае таўшчыню ад 4 да 5,6 см у ім добра захоўваецца арганіка і асабліва вырабы са скуры.

Вельмі актыўна развівалася ў Цвяры выяўленчае мастацтва Мясцовыя мастакі ў XIII-XV стст. мелі ўласную жывапісную школу. Найбольш вядомыя абразы і мініяцюры да рукапісаў. Яны вылучаюцца экспрэсіяй вобразаў і лінейнасцю пісьма.

Таксама ў Цвяры вяліся і ўласныя летапісы, прычым некаторыя рукапісныя шэдэўры дайшлі да нашых дзён. Сярод іх вылучаецца „Хроніка Георгія Амартола".

Да буйных цвярскіх гарадоў можна аднесці Кашын, Ксняцін, Зубцоў, Старыцу (дзе здабывалі белы камень для будаўніцтва), Холм, Мікулін і Дарагабуж. На мяжы ВКЛ, Вялікага Ноўгарада, Маскоўскай дзяржавы і Цвяры стаяў горад Ржэў, дзе беларуская прысутнасць была зафіксавана яшчэ на этнаграфічных картах XIX-пачатку XX стст. Пэўны час Ржэвам адначасова валодалі і ВКЛ, і Ноўгарад, а жыхары горада сваю даніну дзялілі напалам паміж двума вышэйзгаданымі ўладальнікамі.

У XIV ст. змаганне паміж цвярскімі і маскоўскімі князямі за ярлык на вялікае ўладзімірскае княжэнне ўзмацнілася. Як напісаў адзін сучасны рускі гісторык, на баку цвярскіх князёў былі правы старшынства, асабістае геройства, юрыдычныя і маральныя сродкі. На баку маскоўскіх — грошы і майстэрства прыстасавання да аб-

ставін. У гэты час Цвер наладзіла сяброўскія адносіны з ВКЛ. У 1320 годзе дачка Гедзіміна Марыя выйшла замуж за цвярскога князя Міхаіла, а неўзабаве дачка Кейстута выйшла за князя Івана Міхайлавіча. Даволі часта палкі Цвяры ваявалі разам з войскамі ВКЛ супроць крыжакоў. У змаганні з цвярскімі князямі маскоўскія ўвесь час абапіраліся на Арду і татарскія войскі. Так, маскоўскі князь Юры Міхайлавіч знішчыў у Ардзе свайго сваяка Міхаіла Цвярскога, але неўзабаве быў сам забіты ягоным сынам.

У 1327 Цвер узначаліла паўстанне супроць Арды. У горадзе быў забіты татарскі пасланнік і ягоны аддзел. Тады залатаардынскі хан даручыў маскоўскаму князю Івану Каліце пакараць цверцаў. Каліта ўзначаліў татарскае войска, знішчыў паўстанцаў і дашчэнту разрабаваў Цвярскую дзяржаву. За гэта ў 1328 г ён атрымаў тытул Вялікага князя.

Аднак Цвер паступова адрадзілася і з дапамогай вялікага князя літоўскага Альгерда, які ў 1347 годзе другі раз ажаніўся на цвярской княжне Юльяне, працягвала змагацца з Масквою. У лістападзе 1368 г. Альгерд падтрымаў цверцаў, пайшоў на Маскву аблажыў яе і тры дні стаяў пад сценамі горада, пакуль не атрымаў выкуп.

У 1370 г. маскоўскі князь Дзмітры зноў нападае на Цвер Альгерд робіць другі паход на Маскву і бярэ яе ў аблогу 6 снежня 1370 г. У гэты час цвярскі князь атрымлівае ў Ардзе ярлык на валоданне Уладзімірскім княствам. У 1372 годзе войскі ВКЛ начале з Вітаўтам і Кейстутам зноў уварваліся ў Масковію, каб падтрымаць свайго хаўрусніка. У 1375 годзе маскоўскі князь Дзмітры арганізаваў своеасаблівы „крыжовы паход” на Цвер, мабілізаваўшы вайсковыя дружыны 19 удзельных князёў. Цвярскі князь Міхаіл мужна абараняўся, аблога Цвяры доўжылася 5 тыдняў але горад не здаваўся. Тады захопнікі разбурылі і знішчылі іншыя паселішчы вакол горада. Князь Міхаіл прапанаваў памірыцца што і было зроблена.

У 1385 годзе цвярскі князь Васіль Міхайлавіч ажаніўся на дачцэ кіеўскага князя Уладзіміра Альгердавіча і сувязі з дынастыяй Гедзімінавічаў зноў узмацніліся. Гэтаму спрыяла і тое, што сын віцебскага князя і цвярской княжны Ягайла ў 1386 годзе стаў польскім каралём. У 1430 годзе вялікі князь Вітаўт разам з маскоўскім князем Васілём Васілевічам запрасіў на сваю каранацыю і цвярскога князя Барыса Аляксандравіча. Шэсць тыдняў балявалі госці у князя Вітаўта, але каранацыя не адбылася, бо на дарозе праз Польшчу карону скралі, і Вітаўт неўзабаве памёр.

Аднак сувязі цвярскіх князёў і Гедзімінавічаў засталіся моцнымі, бо ад Альгерда цвярская княжна нарадзіла сем сыноў сярод іх і знакамітага Ягайлу.

Найбольшы росквіт эканомікі і культуры цвярской дзяржавы прыпадае на першыя дзве трэці XV ст, калі ў Масковіі ішлі доўгія грамадзянскія войны і набегі на Цвер спыніліся.

У пачатку XV ст. цвярскі князь Іван Міхайлавіч чаканіць свае грошы. Шырокая слава ідзе пра цвярскіх гарматнікаў лепшых на Русі. У сярэдзіне XV ст. у пісьмовых крыніцах згадваецца імя знакамітага майстра-гарматніка Мікулы Крачэтнікава.

Апошні росквіт дзяржавы адбываецца пры князі Барысе Аляксандравічы. Вядома яго асабістая зброя — рагаціна (від дзіды) з надпісам, што гэта рагаціна вялікага князя Барыса Аляксандравіча. Рукаяць яе абкладзена срэбрам і мае шмат гравіровак Сярод іх сцэны барацьбы, палявання, гутаркі, мыцця ў лазні пачастунку і г.д.

Аднак пры Іване III Масковія зноў узмацнілася, вызвалілася ад ардынскай залежнасці і захапіла землі Ноўгарада. Наступіла чарга і Цвяры. Спачатку тут, як у Ноўгарадзе ці Пскове альбо газані была створана сярод баяр свая „пятая калона", якую Масква падкупіла грашыма. Вялікі князь літоўскі Казімір стаўшы адначасова і польскім каралём, не захацеў падтрымаць ні Ноўгарад, ні Цвер. У верасні 1485 года войскі Івана III атачылі Цвер. Праз некалькі дзён падкупленыя баяры перайшлі на бок Масквы, і цвярскі князь Міхаіл Барысавіч з невялікай дружынай здолеў дабрацца да межаў ВКЛ, а яго маці, княжну Настассю ўзялі ў палон і вывезлі ў Маскву. „І так скончылася Вялікае Княства Цвярское — сумна адзначыў летапісец у Валынскім кароткім летапісе.

Згубіўшы пасля Ноўгарада свайго апошняга надзейнага саюзніка на Усходзе, ВКЛ стала неўзабаве несці вялікія паразы ад Масковіі і ў 1513 годзе страціла Смаленск. Толькі бітва пад Оршай часова прыпыніла маскоўскую агрэсію да пачатку Лівонскай вайны.

Новы цар Масковіі Іван IV Жахлівы не забыўся пра Цвер і яе насельнікаў, тым больш, што менавіта там часта ўспаміналі былое вольнае жыццё, калі была свая ўлада, шчыльна звязаная з дынастыяй Ягелонаў. У снежні 1569 г. войскі Івана Жахлівага з усіх бакоў акружылі Цвер і стаялі пяць дзён. Спачатку абрабавалі святароў, пачынаючы з епіскапа, потым гараджан. Напрыканцы зноў уварваліся ў горад і забілі мноства простых людзей, сярод іх шмат жанчын і дзяцей. Потым па загаду Івана IV прывялі палонных палачанаў і немцаў, пасеклі на кавалкі і целы пакідалі ў Волгу пад лёд. Потым разграмілі Таржок і Ноўгарад.

***Прайшоў час...***

У XVIII стагоддзі Цвер паступова адбудоўваецца, а з 1775 года становіцца цэнтрам губерні. І, нягледзячы на стагоддзі асіміляцыі і этнічныя чысткі Івана Жахлівага, беларуская прысутнасць у некаторых паветах Цвярской губерні застаецца і ў XIX ст. Паводле перапісаў, беларусамі запісалася каля 125 тысяч чалавек, якія жылі ў Ржэўскім, Зубцоўскім і Асташкаўскім паветах. Найбольш захоўвалі сваю беларускасць сяляне, што жылі на берагах рэчкі Туд, якая ўпадае ў Волгу. Яны захоўвалі мову адпаведнае аддзенне і нават гралі на дудзе. Гэтых прыволжскіх беларусаў называлі тудаўлянамі. У 1903 годзе іх налічвалася каля тысяч чалавек. Нягледзячы на сталінскія тэрор і ваенныя дзеянні, калі ў 1941 г. немцы захапілі Цвер, прыкметы беларушчыны сярод тудаўлян былі зафіксаваныя мясцовымі краязнаўцамі нават у сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя.

У пасляваенны час мела месца новае нарастанне беларускай прысутнасці ў Цвяры, звязаная з асаблівасцямі будаўніцтва вайскова-прамысловага комплексу СССР. У Цвяры былі размешчаны галоўныя ўстановы Войскаў Супрацьпаветранай абароны краіны Вайсковая акадэмія СПА і галаўны навукова-даследчы інстытут СПА, а ў Менску ў 50-я гады размясцілася Менская вышэйшая інжынерная радыётэхнічная вучэльня, пазней Менская вышэйшая інжынерная зенітная ракетная вучэльня. Менскія выпускнікі, як спецыялісты, былі на галаву вышэй выпускнікоў іншых вучэльняў таму многія з іх аказваліся ў НДІ ў Цвяры, а многія паступалі ў акадэмію. Пры гэтым частка заставалася ў акадэміі на пасадах выкладчыкаў, беларусы станавіліся начальнікамі вядучых кафедраў і аддзелаў. Большасць з іх — дактары і кандыдаты ваенных і тэхнічных навук. Само сабой у Цвяры склалася беларускае зямляцтва з элітнай часткі афіцэрства, моцнае беларускае лобі. Лідэрам і душой зямляцтва быў старшы выкладчык акадэміі кандыдат ваенных навук, палкоўнік Вікенці Чорны (родам з Клецка). Актыўныя ролі выконвалі В. Шуверткоў (Клецк) Я. Яўменчык, І. Прыступюк, Г. Казлоў, беларусы з ліку слухачоў акадэміі.

У канцы 80-х — пачатку 90-х зямляцтва набыло ярка выражаныя нацыянальныя рысы. Адбылося гэта пасля паступлення у 1988 годзе на завочны факультэт з высокіх пасадаў у войску Віктара Бычко (родам з Іўеўскага раёна, узнагароджаны медалём За баявыя заслугі", служыў у сістэме Галоўнага штаба Войск СПА), Станіслава Судніка (родам з-пад Нясвіжа, медаль „За баявыя заслугі", служыў на буйнейшым палігоне Войск СПА) Міхаіла Ананіча (родам з Глыбокага),

Міхаіла Дубовіка (родам з Узды, медаль „За баявыя заслугі”, служыў у Маскоўскай акрузе СПА ). У акадэміі загучала беларуская мова.

Былі ўстаноўлены сувязі з нацыянальнымі суполкамі ў Беларусі. У акадэмію пайшла адраджэнцкая літаратура.

Пасля распаду Савецкага Саюза на кафедрах акадэміі пачалася распрацоўка Стратэгіі будаўніцтва Узброеных Сілаў Беларусі. Група афіцэраў, у тым ліку Вікенці Чорны і Станіслаў Суднік, прыехала ў Менск, пабыла на прыёмах у С. Шушкевіча і В. Кеб.ча, але паразуменне не знайшла. Магутны навуковы патэнцыял цэлай акадэміі аказаўся ў Беларусі не патрэбным

Напачатку 1992 года ў Цвяры намаганнямі палкоўніка В. Чорнага, падпалкоўнікаў В. Шуверткова і С. Судніка быў адкрыты беларускі нядзельны клас на базе сярэдняй школы № 23 што на вул М. Горкага. У той час да вайскоўцаў у Цвяры ставіліся вельмі добра і да беларусаў таксама, на мітынгах называлі не інакш, як братамі, таму ніякіх праблем арганізацыйнага плану не узнікла. У клас было набрана каля 15 дзяцей рознага ўзросту, якія беларускую мову амаль не чулі, але з першых урокаў яна загучала з вуснаў малых беларусаў зусім натуральна, без ніякага акцэнту. Заняткі па беларускай мове, літаратуры і беларусазнаўству вёў Станіслаў Суднік. Дзеці займаліся ахвотна і паказвалі неблагія поспехі. Падчас вучобы яны цалкам усведамлялі сябе беларусамі і гэтыя паўгода беларускага навучання аказалі сур'ёзны ўплыў на фармаванне іхняга светапогляду, на ўсведамленне сябе грамадзянамі далёкай, маладой, незалежнай дзяржавы.

Вось як склаліся лёсы некаторых вучняў гэтага беларускага класа:

Юлія Казлова з адзнакай скончыла Цвярскі дзяржаўны політэхнічны універсітэт. На сёння яна аспірантка гэтага універсітэта;

Наталля Чорная з залатым медалём скончыла ліцэй. Тройчы перамагала на абласных алімпіядах па англійскай мове, адзін раз была 2-й на Усерасійскай алімпіядзе па англійскай мове. На сёння студэнтка Цвярскога дзяржаўнага універсітэта;

Вераніка Шуверткова з адзнакай скончыла Цвярскі дзяржаўны універсітэт;

Марына Шуверткова скончыла Цвярскі дзяржаўны універсітэт.

Нажаль праз 12 гадоў адсачыць лёсы ўсіх вучняў не так проста. Некаторыя з іх выехалі ў Беларусь, тым не менш, як бачна, беларуская прысутнасць у Цвяры захоўваецца. Беларусы знаходзяцца на генеральскіх і палкоўніцкіх пасадах у расейскім войску, вучацца і працуюць, проста жывуць у прыгожым крывіцкім горадзе Цвер.

Напрыканцы свайго аповеду пра забытую беларускую дзяржаву, хачу прывесці цытату з кнігі аднаго з сучасных расійскіх гісторыкаў, які жыве ў Краснаярску, Андрэя Буроўскага: „Там, дзе ваюють Масква і Літва, ваююць Еўропа і Азія. Невыпадкова ж мяжа гэтых частак свету з XV ст. і да гэтага часу ўпарта праводзіцца праз тэрыторыю Русі. І выбар Суздалем і Цвер'ю паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Масквой — гэта не проста выбар васала паміж двума сюзарэнамі і не проста рашэнне, у якую дзяржаву ўвайсці, паболей і памацней. Гэта выбар паміж Еўропай і Азіяй". Дарэчы, невыпадкова еўрапейцы на сваіх картах пабач з ВКЛ на ўсходзе, на месцы Масковіі змяшчалі надпіс „Вялікая Татарыя", бо да 1480 года Масковія была часткай вялікай азіяцкай дзяржавы Залатой Арды.

Таму, каб зноў не апынуцца ў складзе новай „еўраазійскай" дзяржавы разам з Чачэніяй і Татарстанам, нам трэба добра ведаць сваю гісторыю. І зусім невыпадкова звесткі пра гісторыю і культуру Цвярской дзяржавы ў расійскіх падручніках і энцыклапедыях знайсці вельмі цяжка. Цвер і зараз засталася для Масквы Карфагенам, які абавязкова павінен быць разбураны.

Бальшавікі ў 1931 годзе нават змянілі назву гэтага старажытнага горада на Калінін, каб нічога не сведчала пра былую славу вольналюбівых цверцаў. Аднак рухнуў СССР, Цвер зноў з'явілася на геаграфічнай карце Еўропы, а мы ніколі не павінны забываць пра беларускую прысутнасць на берагах Волгі і пра тое, што Волга якую расейцы называюць вялікай рускай ракой, пачынаецца на крывіцкай (беларускай) зямлі, як і Днепр, як і Заходняя Дзвіна

## Пскоўская рэспубліка

На тэрыторыі сённяшняй Пскоўскай вобласці крывічы з’явіліся ў VII-VIII ст. і дайшлі да паўднёвых берагоў Чудскага возера. Яны увесь час кантактавалі з мясцовымі фіна-ўгорскімі плямёнамі і таму склалі асобную групу пскоўскіх крывічоў, якія мелі пэўны тып жаночых упрыгожванняў. Упершыню пскоўскія крывічы згадваюцца ў “Аповесці мінулых гадоў” пад 859 годам у сувязі з іх сумесным паходам на Візантыю ў складзе войска кіеўскіх князёў Алега і Ігара. Пад 862 годам у летапісе згадваецца вараг Трувор, што пасяліўся сярод пскоўскіх крывічоў на гарадзішчы, якое ў яго гонар названае Труворавым. Пазней, у 1329 г. тут будуецца мураваная цвярдыня, што дайшла да нашых дзён, і ўзнікае горад Ізборск, які ў канцы XIV-пачатку XV стст. меў пасады і гарадскі могільнік.

У VIII ст. узнікае гарадское паселішча пад назовам Пскоў на высокай скале ў сутоцы рэчак Вялікай і Пскавы. Археолагі знайшлі ў гістарычнай частцы горада шматлікія рэшткі дахрысціянскіх ахвярнікаў, што стаялі цэлымі шарэнгамі. Яны мелі авальную форму, былі складзены з чыстага рачнога пяску і абкладзены па перыметры каменнымі плітамі. Побач ляжалі шкілеты коней, прынесеных у ахвяру. Такім чынам, горад быў буйным рэлігійным цэнтрам у крывіцкіх землях.

Першы раз у летапісе Пскоў згадваецца пад 903 годам. З X стагоддзя ён у складзе Кіеўскай Русі, а з XII ст. належыць Наўгародскай дзяржаве. У 1240 годзе горад захапілі крыжакі, але ў 1242 годзе яго вызвалілі войскі ноўгародскага князя Аляксандра Неўскага.

Самай старажытнай часткай горада з'яўляецца дзядзінец, што спачатку меў драўляныя, а потым (з XIII ст) каменныя умацаванні і атрымаў назву Пскоўскі Крэмль, альбо Кром У пане гэта няправільны шматграннік, абнесены муравынымі сценаміз вежамі, якія складзены з вапняковых пліт шэрага колеру. Найбольш вядомыя вежымаюць назвы Куцякрома (1400 г.) і Смердзя. У сярэдзіне XIII ст. зрабілі каменную паўднёвую частку сцяны Крома, т.зв. Першы ці Персі. Сцяна выходзіць на р. Вялікая, адкуль пачынаюцца умацаванн, іншых гарадскіх кварталаў.

Раскопаныя археолагамі рэшткі першых жытлаў гараджан ўяўлялі сабою паўзямлянкі чатырохвугольнай формы памерам 3x3,5 м заглыбленыя ў зямлю на 30-40 см. Сцены пабудоў былі абмазаныя глінай, яны ацяпляліся вогнішчамі, абкладзенымі камянямі.

З XIII ст. да Крома прыбудаваны яшчэ адзін умацаваны гарадскі квартал, які атрымаў назву Даўмонтаў горад. На працягу XIV-XV ст. тут узвялі шэсць мураваных храмаў і мураваныя палаты. Археолагі знайшлі рэшткі гэтых будынкаў, а таксама сляды старажытных вуліц, вымашчаных драўлянымі плахамі на лагах. Шырыня іх вагалася ад 3 да 3,15 м, а паабапал стаялі платы з абчасаных бярвенняў дыяметрам ад 8 да 12 см. Быў знойдзены і драўляны вадаправод у выглядзе труб, што складаліся з двух Жолабаў, абгорнутых бяростай. Гараджане ў гэты час жылі ў драўляных хатах плошчай у сярэднім 20-25 м2.

У 1309 годзе ўзводзяць трэцяе кола гарадскіх сцен і з'яўляецца ўмацаваны „Сярэдні горад". У канцы XIV- пачатку XV стст. гарадскія сцены дабудавалі і павялічылі іх таўшчыню да 4 метраў, а таксама зрабілі 6 вежаў з байніцамі. У другой палове XIV ст. узводзіцца новы мураваны сабор св. Троіцы, 20 мураваных храмаў у розных частках горада і чацвёртае кола гарадскіх сцен, абнесенае глыбокім ірвом. Асобны раён горада называўся Запскоўскім і знаходзіўся на другім беразе рэчкі Пскавы.

У канцы XII ст. за рэчкай Вялікай, на адлегласці 1,5 км ад дзядзінца, быў узведзены першы мураваны Спаса-Міросжскі сабор. Храм быў зроблены ў тэхніцы мяшанай муроўкі, дзе чаргаваліся рады тонкай цэглы — плінфы і каменных пліт. Сабор быў распісаны ўнікальнымі фрэскамі. Яшчэ адзін прыгожы сабор Нараджэння Багародзіцы быў узведзены ў 1310 годзе ў Снетагорскім манастыры. Храм быў складзены з каменнай пліты і меў шыкоўны фрэскавы роспіс.

З XIV ст. склалася самастойная пскоўская будаўнічая школа, якая стала адрозніваца ад наўгародскай. Пскоўскія дойліды стварылі аднакупальную, трохапсідную кубічную кампазіцыю храма, а таксама асобны тып бессluповага храма з сістэмай прытупкавых скляпенняў. Плоскія пабеленыя сцены падзялялі плоскімі лапаткамі на тры часткі з паўкруглымі аркамі ў завяршэнні храма. У якасці прыкладу можна прывесці царкву Успення ў Мялетаве (1463 г.). Адной з адметных рысаў пскоўскай школы былі высокія шматпралётныя званіцы.

Пазней, у XVI-XVII стст. у Пскове будавалі вялікія, у некалькі паверхаў, купецкія дамы з тоўстымі сценамі (каля 2 м.). У сценах былі лесвіцы, пераходы, нішы і схованкі. Аконныя праёмы рабіліся ў выглядзе амбразур, зачыняліся кованымі аканіцамі і кратамі. З боку двара быў высокі ганак на шырокіх слупах з аркамі (да прыкладу — палаты Паганкіных, збудаваныя каля 1645 г) Пскоўскіх дойлідаў запрашалі напрацу ў розныя гарады, у тм ліку, і ў Маскву.

У XIV -XV стст. расквітнела і пскоўская школа жывапісу. Творы маюць павышаную экспрэсію вобразаў, падкрэсленасць блікаў і

выразнасць мазка пэндзля. Гэта фрэскі вышэйзгаданых сабора Раства Багародзіцы і царквы Успення. Да другой паловы XIV ст. адносяцца унікальныя абразы „Сабор Маці Божай” і “Параскева Пятніца, Варвара і Ульяна”.

У XV ст. узнікае славуты пскоўска-пячорскі манастыр у мясцовасці Пячора, які меў абароннае значэнне. У 1473 г збудавалі першую падземную пячорную Успенскую царкву. У XVI ст. вакол манастыра ўзнікае пасад, які абнеслі разам з манастыром мураванай сцяной з 9 вежамі. Уваход ішоў праз Святыя вароты з вежай. Падземныя пячоры маюць даўжыню каля 200 м. У XVI ст. у манастыры зрабілі шматпралётную двух'ярусную вежу-званіцу з гадзіннікам. У XVI-XVII ст. тут будуюць 4 цэрквы, якія дайшлі да нашых дзён.

У 1465 годзе ўзнікае пятае кола гарадскіх сцен Пскова. Горад дзяліўся на 7 канцоў, з іх два — у Запскоўі. Канцы падзяляліся на сотні. За межамі горада з’явіліся рамесныя слабоды. У цэнтрах канцоў альбо слабод пачалі будаваць храмы, якія адначасова былі і складамі зброі.

У XVI ст. гарадскія сцены мелі даўжыню 9 км і 37 вежаў з якіх вылучалася вежа Грамячая, збудаваная ў 1524 годзе.

Пскоўская дзяржава была невялікай і займала тэрыторыю уздоўж рэк Вялікая і Нарова. З поўдня на поўнач яна мела даўжыню каля 300 км пры шырыні каля 100 км. Акрамя рэчак Пскоўская зямля мела і два буйныя возеры — Чудскае і Пскоўскае.

Вышэйшы орган улады — народнае веча, якое выбірала спачатку аднаго, а потым з 1420 г. — двух пасаднікаў, канчанскіх стараст і соцкіх. Існавала ўрадавая рада на чале з запрошаным (наёмным) князем, які кіраваў баявой дружынай і служыў за грошы (корм). Была і судовая калегія — гаспода, у якую ўваходзілі выбарныя сябры з ліку баяр.

Пскоўскае грамадства складалася з баяр, але не вельмі багатых, купцоў, рамеснікаў і вольных сялян, якіх звалі земцы, альбо сябры. Сяляне бедныя бралі зямлю ў арэнду і называліся ізорнікі. Аднак халопаў тут не было.

Вялікі ўклад у атрыманне Псковам незалежнасці ад Ноўгарада зрабіў князь Даўмонт. Гэты Нальшчанскі князь у 1263 годзе забіў Міндоўга, заснавальніка ВКЛ і ў 1265 г. з дружынай у 300 чалавек уцёк у Пскоў, ратуючыся ад войска сына Міндоўга — Войшалка. У 1266 годзе ён прымае хрысціянства і імя Цімафей і абіраецца князем. Доўгі час ён ваюе з крыжакамі, а таксама з Полацкам і нават забівае Полацкага князя Гердзеня. Пасля смерці князя кананізавалі як

Святога Цімафея — абаронцу Пскова, а яго меч лічыўся сімвалам незалежнасці.

У часы Гедзіміна Пскоў хацеў канчаткова вызваліцца з залежнасці ад Ноўгарада, і таму яго адносіны з ВКЛ значна палепшыліся. Актыўна памагаў пскоўцам зяць Гедзіміна Давыд Гарадзенскі. Калі крыжакі ў 1323 годзе асадзілі Пскоў, ён адагнаў іх ад горада і знішчыў сценабітныя машыны крыжакоў.

У 1341 годзе пасоўцы звярнуліся па падтрымку да Альгерда, і ён прыйшоў ім на дапамогу разам з Кейстутам. Сын Альгерда Андрэй быў ахрышчаны і стаў пскоўскім князем з 1342 па 1345 год. Яго намеснікам быў таксама выхадзец з ВКЛ — Юры Вітаўтавіч. У 1342 годзе пры абароне Пскова ад крыжакоў загінуў сын полацкага князя Воіна — Любка.

У 1348 годзе пасля падпісання з Ноўгарадам Болатаўскай дамовы, Пскоўская дзяржава канчаткова стала незалежнай. Аднак духоўная ўлада засталася ў руках наўгародскага ўладыкі, які раз у тры гады прыязджаў у Пскоў і здзяйсняў царковны суд.

У XV ст. эканоміка Пскова знаходзілася на ўздыме. Сяляне вырошчвалі шмат жыта, а таксама пшаніцу, авёс, ячмень. На гародах збіралі добрыя ўраджаі рэпы, цыбулі і капусты. Пскоўскі лён актыўна вывозіўся ў краіны Прыбалтыкі. Актыўна развівалася рыбалоўства, выраблялі вялікія лодкі — уганы. Славіліся і мясцовыя рамеснікі, якія шылі адзенне, апрацоўвалі металы і скуры, выраблялі солад і малолі муку. Пскоўскія муляры запрашаліся на працу ў Масковію і іншыя краіны Усходняй Еўропы. У Пскове таксама квітнеў выраб званоў. Актыўна развіваўся і гандаль з суседзямі — Цвярской дзяржавай, Ноўгарадам, Разанню, ВКЛ, а таксама з нямецкімі краінамі. З 1424 г. Пскоў наладзіў чаканку ўласнай срэбнай манеты з выявай рысі — герба горада.

У XV ст. Пскоў стаў праводзіць прамаскоўскую палітыку і спадзяваўся такім чынам захаваць сваю незалежнасць. Ён падтрымліваў Масковію ў войнах з Ноўгарадам і ВКЛ, асабліва пад час вайны 1500-1503 года. Але гэта не дапамагло пскоўцам, бо Масковія не хацела мець у сябрах незалежную рэспубліку.

13 студзеня 1510 г. маскоўскае войска ўвайшло ў Пскоў, быў спушчаны са званіцы Вечавы звон як сімвал волі і незалежнасці. 300 самых багатых сем'яў пскоўскіх баяр і купцоў адправілі ў высылку. Прычым дазвалялі ўзяць з сабою толькі тое, што апранута на целе. Таму на дзяцей апраналі па 2-3 футры, хавалі залатыя манеты ў жаночую бялізну і нават у задні праход. Як гэта нагадвала раскулачванне ў сталінскія гады!

Да сённяшняга часу захаваліся пскоўскія летапісы XIV-XVII стст. у колькасці 25 спісаў. Найбольш цікавы летапісны збор 1450-60-х гадоў, які вёўся пры Троіцкім манастыры.

Зноў Пскоў адраджаецца ў канцы XVIII ст., калі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай ў 1772 годзе пскоўская правінцыя ператварылася ў губерню з цэнтрам у г. Апочка і ўвайшла ў склад Беларускага генерал-губернатарства. Да 1775 года яно мела правінцыі — Віцебскую, Вялікалуцкую, Дзвінскую Полацкую і Пскоўскую.

У 1776 годзе ад Пскоўскай губерні аддзялілі Полацкую, а цэнтрам пазасталай часткі стаў Пскоў, які быў губернскім горадам да 1927 года.

У 1924 годзе, калі Віцебская губерня ўвайшла ў склад БССР ад яе адрэзалі Веліжскі, Невельскі і Себежскі паветы і перадалі ў Пскоўскую губерню РСФСР. Пры гэтым некаторыя воласці напрыклад, Веліжскага павету, мелі да 72% беларускага насельніцтва. Ёсць звесткі, што ў часы хрушчоўскай адлігі выканкам Невельскага раёна звяртаўся ў Вярхоўны Савет БССР, каб увайсці у склад Беларусі. Аднак пытанне станоўча не было вырашана.

Нядаўна гістарычна-архітэктурны цэнтр г. Пскова і прыродна-гістарычны аб'ект „Ізборск” у якасці адзінай намінацыі Вялікі Пскоў” уключаны ў папярэдні спіс ЮНЕСКА аб'ектаў сусветнай спадчыны і зарэгістраваны ў Цэнтры сусветнай спадчыны.

## Сярэдняя Літва

Пасля распаду буйных імперый і таталітарных краін на тэрыторыі Еўропы і іншых кантынентаў у XX ст., утварылася шмат, як сапраўдных, так і непрызнаных, часта марыянеткавых дзяржаў, якія існавалі нядоўгі час. Але нездарма пішуць, што лепей мець марыянеткавую, але дзяржаву, чым быць пад акупацыяй ці ў складзе іншай краіны, нават дэмакратычнай.

Пасля сканчэння I сусветнай вайны і знікнення Расійскай імперыі ў 1917 годзе такія часовыя дзяржавы ўзнікалі і на тэрыторыі Беларусі. Спробы зрабіць такія дзяржаўныя ўтварэнні рабіліся з розным поспехам, як бальшавікамі, так і палякамі. Дастаткова прыгадаць Літоўска-Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (Літ-Бел) альбо дзяржаву пад назовам Сярэдняя альбо Усходняя Літва.

Пасля таго, як была абвешчана БНР, а пасля адступілі нямецкія войскі, бальшавікі мусілі ў Смаленску 1 студзеня 1919 года абвесціць БССР у этнаграфічных межах рассялення беларусаў. Аднак, ужо 16 студзеня ад БССР адлучылі на карысць Расіі Смаленшчыну, Магілёўшчыну і Віцебшчыну, а ўжо 27 лютага стварылі Літ-Бел са сталіцай у Вільні (гэта былыя Віленская, Гарадзенская і Менская губерні, тэрыторыя, якая да сярэдзіны XIX ст. мела гістарычную назву — Літва). Усё беларускае ў гэтай савецкай дзяржаве было забаронена, а ў войску пераважалі рускія салдаты. Не было тут і нічога літоўскага, акрамя кіраўніка ўраду Вікенція Міцкявічуса-Капсукаса. Бальшавікі разглядалі Літ-Бел як плацдарм для нападу на Польшчу. У чэрвені 1919 года ў войску Літ-Бела было 17450 чырвонаармейцаў.

Польска-савецкая вайна пачалася ў лютым 1919 г. 14 лютага 1919 года ля Бярозы Картузскай адбылася першая бойка паміж бальшавікамі і польскімі войскамі. Ужо 19 красавіка палякі захапілі Вільню, а 28 красавіка — Горадню. Урад Літ-Бела пераехаў у Менск, але 8 жніўня і ў Менск увайшлі польскія аддзелы на чале з генералам Станіславам Шаптыцкім. Літ-Бел практычна спыніла сваё існаванне.

У 1918-1919 гадах нашы суседзі літоўцы даволі паспяхова будавалі сваю дзяржаву, бо ім спачатку актыўна дапамагалі немцы, а потым і краіны Антанты. Іх галоўнае жаданне было уключыць ў сваю дзяржаву ўсю Віленшчыну разам з нашай старадаўняй сталіцай. Бальшавікі на гэта глядзелі спачатку адмоўна, але потым, пасля акупацыі палякамі Літ-Бела — вельмі станоўча, бо Літва аўтаматычна станавілася іх хаўруснікам у змаганні з Польшчай.

11 верасня 1919 года урад Савецкай Расіі заявіў аб згодзе прызнаць Літоўскую дзяржаву і заключыць з ёю мірнае пагадненне

Таму 12 ліпеня 1920 года Ленін прызнае незалежнасць Літвы і перадае ёй даўно захоплены палякамі Віленскі край разам з нашымі гарадамі Горадняй, Шчучынам, Лідай, Ашмянамі Смаргонню і Браславам. 14 ліпеня Чырвонае войска займае Вільню, а ў верасні перадае яе літоўцам. 31 ліпеня ў Менску абвяшчаецца ССРБ, але ў межах толькі былой Менскай губерні.

У 1919-1920-х гадах польскія ўлады не прызнавалі БССР і ЛітБел, нягледзячы на заявы ўрада РСФСР аб тым, што тэрытарыяльныя спрэчкі павінны вырашацца паміж Польшчай і БССР непасрэдна. Яны таксама вялі ваенныя дзеянні з Літвой, бо хацелі захапіць не толькі Віленшчыну, але ўжо і Літву. Аднак пад ціскам Антанты 7 кастрычніка 1920 г. у Сувалках падпісваецца польска- літоўская дамова, паводле якой Віленшчына перадаецца Літве.

Аднак Пілсудскі не збіраўся аддаваць сваю радзіму літоўцам (Юзаф Пілсудскі быў родам з Віленшчыны.) Звязаны абавязкамі перад Антантай, ён у гэтай сітуацыі віртуозна разыграў беларускую карту", інспіраваў „бунт" супраць гэтай дамовы ў частцы польскага войска, так званых „літоўска-беларускіх дывізіях". Літоўска-беларускія дывізіі існавалі ў складзе польскага войска з 1919 года, яны складаліся з „красавякаў" (у асноўным беларусаў-католікаў заходніх рэгіёнаў Беларусі, Беласточчыны і Віленшчыны), якія не вельмі рваліся служыць у каронным войску, а больш ахвотна ішлі ў свае тутэйшыя палкі, працягваючы традыцыі „літоўскага сепаратызму".

Ужо на наступны дзень пасля падпісання „мірнай дамовы" з Літвой, 8 кастрычніка 1920 года „паўстала" 1-я Літоўска-беларуская дывізія на чале з генералам Люцыянам Жалігоўскім. У канцы верасня непасрэдна перад бунтам 1-й Літоўска-беларускай дывізіі, якая складалася з Сувалкаўскага, Гарадзенскага Віленскага і Менскага палкоў, па загаду Пілсудскага былі перададзены найбольш баяздольныя Лідскі і Ковенскі палкі з 2-й Літоўска-беларускай дывізіі. Жалігоўскі захапіў Вільню, абвясціў незалежнасць Віленшчыны і пайшоў на Коўна, захапіўшы па дарозе мястэчка Кейданы. Толькі ў раёне Шырвінтаса літоўцы здолелі спыніць нападнікаў. Перад тварам міжнароднай супольнасці Польшча была „чыстай". Меў месца беларуска-літоўскі канфлікт.

29 лістапада 1920 года пад уціскам Лігі Нацый бакі заключылі замірэнне. Стварылася фармальна незалежная дзяржава пад назовам Сярэдняя Літва. Яе нефармальным кіраўніком стаў генерал Люцыян Жалігоўскі. Гэта наш зямляк, які нарадзіўся ў Ашмянах у 1865 годзе. З 1885 года Люцыян Жалігоўскі кадравы афіцэр рускага войска, удзельнік руска-японскай вайны. Быў камандзірам палка. З ліпеня 1917 года знаходзіўся ў польскім корпусе генерала Доўбар-Мусніцкага, у

складзе якога ваяваў з бальшавікамі ў лютым 1918 года пад Рагачовам. Потым ваяваў у войсках генерала Дзянікіна, дзе кіраваў польскай дывізіяй.

У красавіку 1919 яго дывізія далучылася да польскага войска. З верасня 1919 года Жалігоўскі кіруе войскамі, што наступалі на Менск, ён камандзір першай літоўска-беларускай дывізіі, дзе служылі мясцовыя „краёвыя" палякі. Менавіта гэтая дывізія і „ўзбунтавалася" 8 кастрычніка 1920 года супраць перадачы Віленшчыны Літве.

Жалігоўскі абвясціў 12 кастрычніка незалежнасць Сярэдняй Літвы і фактычна ўзначаліў яе. Пазней ён быў міністрам вайсковых спраў Польшчы і да 1939 года дэпутатам польскага сойму. Потым быў у эміграцыі, падтрымліваў польскі эмігранцкі ўрад. Памёр у 1947 годзе. Дарэчы, у Лідзе да 9 студзеня 1940 года існавала вуліца, названая ў яго гонар. Зараз гэта вуліца носіць імя таксама нашага земляка Фелікса Дзяржынскага.

Новая краіна складалася з 10 паветаў. Акрамя Вільні, найбольш буйнымі гарадамі былі Трокі, Смаргонь і Ашмяны. Горадню і Ліду палякі Жалігоўскаму не аддалі, і адразу ўключылі гэтыя гарады ў склад Польшчы. На тэрыторыі Сярэдняй Літвы жыло 530 тысяч чалавек, з іх беларусы складалі 40 %. Улада была ў руках Жалігоўскага, які на асноўныя кіраўнічыя пасады вылучаў выключна „краёўцаў". Жалігоўскі прызначыў урад — Часовую кіраўнічую камісію на чале з В. Абрамовічам, які быў „краёўцам" і выступаў за федэратыўную дзяржаву накшталт былой Рэчы Паспалітай. Былі свае грошы (польская марка), сімволіка і нават паштовыя маркі.

Першыя маркі выйшлі 20 кастрычніка 1920 года і мелі выяву двух гербаў, польскага арла і нашай „Пагоні". На марках 1920-1922 гадоў можна ўбачыць выявы помнікаў гісторыі і архітэктуры Вільні (сярод якіх касцёл Св. Ганны і Вострая брама), выявы каралевы Ядвігі і Ягайлы, Касцюшкі і Адама Міцкевіча. Некалькі разоў выходзілі маркі з партрэтам Жалігоўскага. У лістападзе 1921 года выйшла марка, прысвечаная ўваходу войска Жалігоўскага ў Вільню 9 кастрычніка 1920 года.

Жалігоўскі, ў адрозненні ад іншых дзяржаўных дзеячоў Польшчы, ставіўся да беларускай справы даволі прыхільна. Урад найвышэйшай рады БНР (у адрозненні ад Ковенскага ўрада на чале з Ластоўскім) падтрымаў новую ўладу. Была нават спроба назваць новую краіну „Заходняя Беларусь", але гэтая прапанова не прайшла.

Сярод прыхільнікаў Жалігоўскага былі Антон Луцкевіч, Аркадзь Смоліч, Браніслаў Тарашкевіч, Максім Гарэцкі і ксёндз Ада м Станкевіч. Тарашкевіч займаў пасаду кіраўніка беларускага сектара ў

дэпартаменце асветы Ўрада Сярэдняй Літвы. У 1921 годзе А. Луцкевіч стварае Беларускі музей імя Івана Луцэвіча, а Б. Тарашкевіч — Таварыства беларускай школы (ТБШ). Была створана віленская беларуская гімназія і беларуская настаўніцкая гімназія ў Барунах (Ашмяншчына).

Вясною 1921 года ў Сярэдняй Літве дзейнічала 186 беларускіх школ.

Пільна сачыў за падзеямі ў Вільні і Янка Купала. У газеце „Звон" у 1919 годзе выходзіць яго артыкул „Уваскрашэнне польскага універсітэту ў Вільні", у якім ён называе Вільню спрэчным горадам, на які заяўляюць свае правы тры дзяржавы — Польшча, Літва і Беларусь.

Спрачаючыся ў Лізе Нацый з Літвою за Віленшчыну, Польшча хацела даказаць, што са сваімі нацыянальнымі меншасцямі яна абыходзіцца сумленна. Пасля падпісання Рыжскай мірнай дамовы на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічала 400 беларускіх пачатковых школ, 7 поўных школ і тры настаўніцкія семінарыі. Часткова фінансавалася беларуская культурная дзейнасць і, нават, беларускі нацыянальны друк. У Сярэдняй Літве існавала самастойная судовая сістэма. Краіна аднак залежала ад грашовых крэдытаў польскага ўраду, а эканоміка — ад стану гаспадаркі Польшчы і польскай грашовай адзінкі — маркі. У 1921 годзе быў распрацаваны праект электрыфікацыі, існавала 432 прамысловых і каля 1370 дробных прадпрыемстваў.

Аднак большасць насельніцтва краіны займалася сельскай гаспадаркай. Да 1923 г. на Віленшчыне быў выдзелены 961 зямельны ўчасток для пасялення польскіх каланістаў-асаднікаў. 6470 гаспадарак, што належалі былым вайскоўцам і дзеячам розных арганізацый, дадаткова атрымалі ў сярэднім на 2,5 га зямлі на кожную гаспадарку. Набываць зямлю маглі толькі тыя сяляне, якія былі палякамі, альбо запісваліся імі, бо належалі да каталіцкай царквы. Некаторыя вёскі рассялялі на хутары.

Пасля захопу Жалігоўскім Віленшчыны, Літва разарвала дыпламатычныя адносіны з Польшчай і да верасня 1939 года знаходзілася з ёю ў стане вайны. Літву падтрымаў ковеньскі ўрад БНР на чале з В. Ластоўскім, а таксама Масква. 9 студзеня 1921 года былі прызначаны выбары ў сойм новай дзяржавы, але супраць выступіла Ліга Нацый, якая прыняла рашэнне правесці тут плебісцыт і хацела ўвесці замежныя войскі.

Аднак гэтае рашэнне аспрэчылі літоўцы і бальшавікі. Адбыліся перамовы ў Бруселі і Жэневе. Міністр замежных спраў Бельгіі Гіманс прапанаваў Віленшчыну аддаць Літве, як аўтаномную вобласць і ўключыць Літву ў вайсковы і эканамічны саюз з Польшчай (Чым не

саюзная дзяржава сённяшняй Расіі і Беларусі?). Але Літва ад такога варыянту адмовілася.

Польшча пастаянна ціснула на Жалігоўскага, патрабуючы найхутчэйшага ўключэння Сярэдняй Літвы ў склад Польшчы. 16 студзеня 1921 года выканаўцам абавязкаў старшыні Часовай кіраўнічай камісіі быў прызначаны лаяльны да Польшчы генерал Стэфан Макрэцкі родам з маёнтка Дзітрыкі Лідскага павету, які перад гэтым пэўны час камандаваў 1-м корпусам войска Сярэдняй Літвы і кіраваў баявымі дзеяннямі на літоўскім фронце ажно да замірэння. Стэфан Макрэцкі выконваў абавязкі старшыні Часовай кіраўнічай камісіі да прызначэнне 21.11.1921 г. на пасаду старшыні Аляксандра Мяйштовіча.

30 лістапада 1921 Жалігоўскі перадаў Мяйштовічу ўсю ўладу і выехаў з Вільні ў Польшчу.

Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні ў канцы 1921 года адмовіўся ад удзелу ў выбарах 8.01.1922 г. і абвясціў байкот. Байкот у сваіх мэтах падтрымлівалі і мясцовыя літоўцы. У выніку ў выбарах удзельнічала 64,4% выбарцаў, якія абралі толькі „прапольскіх" дэпутатаў. 20 лютага 1922 новы сойм Сярэдняй Літвы прыняў рашэнне аб далучэнні да Польшчы, і Ліга Нацый яго падтрымала. 24 сакавіка гэтае рашэнне пацвердзіў польскі сойм, і дзяржава спыніла сваё існаванне.

6 красавіка Сярэднюю Літву пераўтварылі ў Віленскую зямлю на правах ваяводства. У снежні 1925 г. Віленскую зямлю назвалі Віленскім ваяводствам, у якім 9 паветаў складала беларускае насельніцтва. Аднак успаміны пра Сярэднюю Літву яшчэ жылі сярод мясцовых жыхароў. Напрыклад, у 1926 г. у Горадні Каміла Макрэцкая напісала паэму „1919 год, альбо песня пра літоўска-беларускія дывізіі", дзе панавалі мясцовыя „краёвыя" настроі.

У верасні 1939 года ў сталіцу Заходняй Беларусі Вільню ўвайшлі савецкія войскі, і ўвесь Віленскі край збіраўся ўвайсці ў склад БССР. Аднак 10 кастрычніка савецкі ўрад перадаў Вільню і частку Віленшчыны (7120 км$^2$ з 457000 жыхароў) Літве. Даведаліся ж аб гэтым беларусы толькі 1 лістапада 1939 года, пасля выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі. 2 лістапада ў Вярхоўным Савеце СССР камісар замежных спраў Вячаслаў Молатаў на гэты конт сказаў наступнае: „Віленскі край належыць да Літвы не па сваім насельніцтве. Мы ведаем, што большасць насельніцтва ў гэтым раёне — не літоўцы. Але гістарычная мінуўшчына і памкненні літоўскага народа шчыльна звязаныя з горадам Вільняй, і ўрад СССР палічыў неабходным пайсці насустрач гэтым маральным меркаванням".

У савецкія часы пра Сярэднюю Літву, у адрозненні ад Літ- Бела, не згадвалі ў школьных і універсітэцкіх падручніках. І толькі зараз гістарычная праўда вяртаецца да нас.

**Спіс навуковых і вучэбна-метадычных работ, науковых і навукова-папулярных публікацый дацэнта кафедры гісторыі і музеязнаўства, кандыдата гістарычных навук Трусава Алега Анатолевіча за 1976-2004 гады**

***1976 год***

1. Сенніцкі могільнік. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. №2. С. 21-23. Сааўтар Егарэйчанка А.А.
2. Спатканне з мінулым. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. №3. С. 48-51.
3. Археалагічныя пошукі ў Полацку. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1976. №4. С. 41.

***1977 год***

4. Археологическое изучение белорусских памятников архитектуры. Артыкул. Материалы научной конференции молодых историков Литвы и Белоруссии. Вильнюс, 1977. С. 103-106.

***1978 год***

5. Раскопки в Лидском и Гродненском замках. Артыкул. Археологические открытия 1977 года. М., 1978. С. 425-426.

***1979 год***

6. Раскопки в Лидском замке. Артыкул. Археологические открытия 1978 года. М., 1979. С. 446-447. Сааўтар Паничева Л.Г.
7. Архітэктурна-археалагічнае даследаванне Лідскага замка. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1979. №4. С. 18.

***1980 год***

8. Зброя Лідскага замка. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1980. №2. С. 26-27.
9. Археалагічнае даследаванне Мірскага замка. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1980. №4. С. 33-34.
10. Исследования старого Минска. Артыкул. Археологические открытия 1979 года. М., 1980. С. 368. Сааўтары Позняк З.С., Соболь В. Е.
11. Раскопки Могилевской ратуши и Заславльского замка. Артыкул. Археологические открытия 1979 года. М., 1980. С. 369-370.
12. Археалагічнае вывучэнне помнікаў беларускай манументальнай архітэктуры XIII-XVIII стст. Артыкул.Весці АН БССР. Сер. Грамад, навук. 1980. №6. С. 84-92.

## *1981 год*

13. Исследования средневековых замков Белоруссии. Артыкул. Археологические открытия 1980 года. М., 1981. С. 345-346.

14. Историко-архитектурные исследования и реставрация Лидского замка. Артыкул. Вопросы архитектуры Литовской ССР. 1981. Т. 7(2). С. 28-39. Сааўтар Богласов С. Г.

15. Кафля Лагойскага замка. Артыкул. Беларусь. 1981. №5. С. 32. Сааўтары Штыхаў Г., Угрыновіч У.

16. Археологические исследования исторического центра г. Мозыря. Артыкул. Археологические исследования в исторических центрах городов Литовской ССР. Вильнюс, 1981. С. 77-78. Сааўтар Боровой Р.В.

17. Археологическое изучение памятников монументального зодчества XI-XVII вв. на территории Белоруссии (Методические исследования). Аўтарэферат. Автореф. дис. канд. ист. наук. Л., 1981, 26 с.

18. Посуд Лідскага замка (Па матэрыялах археалаг. раскопак). Артыкул. Літ. і мастацтва, 1981, 13 лютага. С. 14. Сааўтар У. Угрыновіч.

19. Камянецкі стоўп. Артыкул. Там жа, 5 чэрвеня. С. 16.

20. Каб ажылі сівыя муры ... (Аб рэстаўрацырыі Мір. замка Карэл.р-на). Артыкул. Там жа, 23 кастр. С. 14-15. Сааўтары Д.Бубноўскі, І. Чарняўскі.

21. Архитектурно-археологические исследования исторического центра г. Могилева. Тэзісы. Археологические исследования в исторических центрах городов Литовской ССР: Тез. науч.-практ. конф. Вильнюс, 1981. С. 73-74.

*Публікацыі пасля абароны кандыдацкай дысертацыі*

## *1982 год*

22. Сівая спадчына Гальшан (Архіт. помнікі). Артыкул. Літ. і мастацтва, 1982, 12 сакавіка, С. 14-15. Сааўтары А.Бубноўскі, І. Чарняўскі.

23. Новае пра Бельчыцкі манастыр (Полацк). Артыкул. Там жа, 14 мая, С. 13.

24. Знаходкі ў старажытным Мсціславе (Па матэрыялах археал. раскопак). Артыкул. Там жа, 15 кастрычніка С 16

25. Археалагічныя даследаванні. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1982. №2. С. 39-40.

26. Архитектурно-археологические исследования в реставрационных мастерских БССР. Артыкул. Охрана, исследования и регенерация памятников-комплексов истории и культуры. Клайпеда, 1982

27 Археологическое изучение Полоцкой Софии. Артыкул Древности Белоруссии и Литвы. Мн., 1982. С. 165-172

### *1983 год*

28. Археологическое изучение архитектурных памятников Белоруссии. Артыкул. Археологические открытия 1981 года. М., 1983. С.

29. Паліхромная кафля Мірскага замка. Артыкул. Мастацтва Беларусі 1983. № 3 с. 39

30. Беларуская паліхромная кафля. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. №4. С. 21-22. Сааўтар Угрыновіч У. В.

31. Беларуская чарапіца. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1983. №4. С.30-32

32. Основные типы кладки XI-XII вв. на территории Белоруссии. Артыкул. Древнерусское государство и славяне: Материалы симпозиума, посвящ. 1500-летию Киева. Мн., 1983. С. 114-116

33 Архітэктурна-археалагічнае даследаванне гістарычнага цэнтра Магілёва. Артыкул. Весці АН БССР. Сер. Грамад. навук. 1983. с. 67-76. Сааўтары Чарняўскі І.М., Кукуня В.Р.

34. Мстиславль. Артыкул. Нёман. 1983. №12 С 118-122

35. Кераміка старажытнага Мсціслава. Артыкул. Беларусь. 1983. № 10. с. 19. Сааўтар Здановіч Н.

### *1984 год*

36. Шкло Мірскага замка. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. №3. С.42-43. Сааўтар Ляшкевіч А.

37. Патрэбны даведнік: [Рэц. На кн.: Музей старажытнабеларускай культуры: Каталог экспазіцыі. Мн., 1983]. Рэцэнзія Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. №1. С. 14-15. Псеўданім (Т. Алегаў)

38. Исследования Мозыря. Артыкул. Археологические открытия 1983 года. М. 1984. С. 373-374. Сааўтар Здановіч Н.

39. Вялікапамерная цэгла. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. №1. С. 33-34.

40. Археалогія архітэктуры. Артыкул. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн. 1984, т.1. С. 178.

41. Байніца. Артыкул. Там жа. С.)265.

42. Работа архитектурно-археологической экспедиции. Артыкул. Археологические открытия 1982 года. М., 1984. С. 371-373.

43. Кафля Мірскага замка. Артыкул. Помнікі старажытнабеларускай культуры: Новыя адкрыцці. Мн., 1984. С. 157-162.

44. Рецензия: [на кн.: Милюченков С. А. Белорусское народное гончарство. Мн., 1983]. Рэцэнзія. Нёман. 1984. №12. С. 166-167. Сааўтар Угринович В.

45. З крыніц народнага дойлідства: (Рэц. На кн.: Сергачев С.А. Деревянная архитектура Белоруссии XVI-XIX вв.]. Рэцэнзія. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1984. №1. С. 45.

## *1985 год*

46. Адбіткі вясёлкавых промняў: [Рэц. на кн.: Яніцкая М.М. Беларускае мастацкае шкло: XIX-пач.XX ст.Мн.,1984]. Рэцэнзія. Мастацтва Беларусі 1985 № 11. С. 74.

47. Вечны вандроўнік: (Рэц. на кн.: Ліс А.Вечны вандроўнік: Нарысы пра мастака Язэпа Драздовіча. Мн., 1984]. Рэцэнзія. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1985 № 1. С. 45.

48. Ратушы беларускіх гарадоў. Голас Радзімы. 1985 8 жн. С. 5-6.

49. Помнікі старажытнага Мсціслава. Брашура. Мн. Полымя 1985. Сааўтар Баравы Р. В.

50. Мсціслаўскі посуд XV-XIX стст. Артыкул. Помнікі культуры. Новыя адкрыцці Мн., 1985. 195-201. Сааўтар Здановіч Н.І.

51. Керамічныя падлогі ў інтэр'ерах помнікаў дойлідства беларускага сярэдневякоўя. Артыкул. Помнікі культуры: Новыя адкрыцці Мн., 1985. С. 190-195. Сааўтар Чарняўскі І.М.

52. Из истории архитектурной археологии Белоруссии. Артыкул. Археология и история Пскова и Псковской земли. Псков, 1985. С. 66-68.

53. Мир. Артыкул. Нёман, 1985 N8. С. 141-146. Сааўтары Бубновский Д., Кравцевич А.

54. 850 сонцазваротаў. [З гісторыі Мсціслава]. Артыкул. Беларусь, 1985, № 11. С. 8.

55. Летнія маршруты археолагаў [Аб рабоце н.-д. праект, бюро Спец. навук.-рэстаўрац. вытвор. майстэрань М-ва культуры БССР. Гутарка з нам. заг. бюро А.А. Трусавым]. Артыкул. Голас Радзімы, 1985, 3 кастр. С. 7-8.

56. [Рэцэнзія] Рэч. на кн.: Каханоўскі Г. А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст. Мн. 1984; Каханоўскі Г. А. Адчыніся, таямніца часу: Гіст.-літ. нарысы. Мн., 1984. Рэцэнзія. Нёман, 1985, №9. С. 170-171. Сааўтар А. Грыцкевіч

57. Изучение памятников архитектуры на территории Белоруссии. Артыкул. Археологические открытия 1983 года М., 1985. С.

58. На вуліцах старога Мінска [Рэц.на кн.: Пазняк З. С. Рэха даўняга часу. Мн., 1985.]. Рэцэнзія. Голас Радзімы 1985, 5 снежня. С. 6.

## *1986 год*

59 Кафля. Артыкул. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн,1986 Т.3. С. 21-22. Сааўтар У.В.Угрыновіч.

60. Лідская кафля. Артыкул. Там жа. С 253. Сааўтар У. В. Угрыновіч

61 Лідскае шкло Артыкул. Там жа. С 253. Сааўтар М.М. Яніцкая

62. Лідская кераміка. Артыкул. Там жа. С 253-254. Сааўтар. У.В. Угрыновіч

63. Лідскі замак. Артыкул. Там жа. С. 254. Сааўтар С.Г. Багласаў

64. Магілёўскае шкло. Артыкул. Там жа. С. 346. Сааўтар М.М. Яніцкая

65. Магілёўская кафля. Артыкул. Там жа. С 348-349. Сааўтар М. І. Чарняўскі

66. Магілёўская кераміка. Артыкул. Там жа. С. 349. Сааўтар Здановіч Н.І.

67. Магілёўская ратуша. Артыкул. Там жа. С 353-354

68. Мазырскае шкло. Артыкул. Там жа. С 395. Сааўтар А.І. Сташкевіч

69. Мазырская кафля. Артыкул. Там жа С 395 Сааўтар Н.І.Здановіч

70. Мазырская кераміка. Артыкул. Там жа. С. 395.

71. Мазырскає шкло. Артыкул. Там жа. С. 638-639. Сааўтар А.І. Сташкевіч

72. Мірская кафля. Артыкул. Там жа. С 639-640

73. Мірскі фаянс. Артыкул. Там жа. С. 642. Сааўтар І.У. Ганецкая

74. Мсціслаўскае шкло. Артыкул. Там жа. С. 674-675. Сааўтары М.М. Яніцкая, А. Б. Сташкевіч.

75. Мсціслаўская кафля. Артыкул. Там жа. С 675

76. Мсціслаўская кераміка. Артыкул. Там жа. С. 675-676. Сааўтар Н.І. Здановіч.

77. Мсціслаўскі Тупічэўскі манастыр. Артыкул. Там жа. С. 677. Сааўтары Л.Л. Чарняўская, Ю.А. Якімовіч.

78. Муроўка. Артыкул. Там жа. С. 706-707.

79. Навагрудская кафля. Артыкул. Там жа. С. 725-726.

80. Компас у краязнаўчым моры [Рэц. на кн.: Каханоўскі Г. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI-XIX стст.]. Рэцэнзія. Голас Радзімы, 1986 29 мая. С. 7.

81. Падарожжа ў Бярэсце: [Рец.на кн.: Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1985]. Рэцэнзія. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1986 № 3. С. 44.

82. Комплексное изучение Мстиславля и его округи. Артыкул. Археологические открытия 1984 года М., 1986. С. 336-337. Сааўтары Л.В. Алексеев, Г.П. Латышева, Е.В.Железнова, Ю.А.Дорофеев.

83. Падарожжа ў краіну фрэсак: [Рэц.на кн.: Церашчатава В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI-XVIII стст. Мн., 1985]. Рэцэнзія. Мастацтва Беларусі 1986 N6. С. 72-73. С. 72- 73.

84. Белорусская черепица XIV-XVIII вв. Артыкул. Советская археология, 1986, № 3. С. 186-191.

85. Возрождение Старого замка: (Гродно: По материалам археолог. раскопок]. Артыкул. Гродн. правда. 1986 13 авг. Сааўтар М. Ткачев.

86. Архитектурно-археологические исследования Мирского замка и городского посёлка Мир Гродненской области. Артыкул. Советская археология, 1986, № 4. 1986. С. 216-235. Сааўтары Чернявский И.М., Кравцевич А.

87. Барысаглебская (Каложская) царква. Артыкул. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобл. Мн. 1986. С. 45-46. Сааўтары А.К. Краўцэвіч, А.М. Кулагін.

88. Стары замак (у Гродне). Артыкул. Там жа. С. 78-80. Сааўтары У.В.Алісейчык, Я.Г.Звяруга, А.К.Краўцэвіч, М.А.Ткачоў.

89. Палацава -замкавы комплекс (у Міры). Артыкул. Там жа. С. 216-218. Сааўтары А.Я. Міцянін, С.Ф. Самбук, А.К. Краўцэвіч.

90. Рэшткі замка (у Лідзе). Артыкул. Там жа. С. 236-237. Сааўтар М.А. Ткачоў.

91. Гарадзішча „Замкавая гара", Вакольны горад (Мсціслаў). Артыкул. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобл. Мн. 1986. С. С. 303-305. Сааўтар М.А. Ткачоў.

92. Рэшткі Тупічэўскага манастыра. Артыкул. Там жа. С. 308- 309. Сааўтар Л.Л. Чарняўская.

93. Крэўскі замак: (У альбом калекцыянера). Артыкул. Мастацтва Беларусі, 1986, N9. С. 48. Сааўтар Ткачоў М.

94. Вандроўнікі з далёкай Беларусі [Рэц. на кн.: Грицкевич В.П. От Немана к берегам Тихого океана.Мн.,1986.]. Рэцэнзія. Голас Радзімы, 1986 30 кастр. С. 8.

95. Исследования архитектурно-археологической экспедиции. Артыкул. Археологические открытия 1984 года М., 1986 С 343-344 Сааўтар Друщиц С.А.

96. Віцебская Благавешчанская [царква]. Артыкул Помнікі гісторыі і культуры Беларусі 1986 N1. С. 36-38

97. Згадкі пра мінулае лета [Аб старажыт. помніках архітэктуры ў рэсп.: Па матэрыялах раскопак]. Артыкул. Літ. і мастацтва. 1986, 20 чэрв. С. 14-15. Сааўтары І. Чарняўскі, А.Кушнярэвіч.

98. Горад на Віхры (Рэц. на кн. Караткевіч У. Мсціслаў). Рэцэнзія. Голас Радзімы, 1986, 13 лютага. С. 8

99. Родам з Мціслаўшчыны. Рэцэнзія. Там жа. 1986 № 30. 20 ліпеня

100 Новае пра Стары замак (Археал. раскопкі ў Гродна) Артыкул. Там жа. 1986, 18 верасня. С. 8. Сааўтар М Ткачоў.

## *1987 год*

101 Полацкая кафля. Артыкул. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн.1987.Т.4. С. 324. пратуры і

102. Полацкі княжацкі храм. Артыкул. Там жа. С. 330

103. Полацкі храм-пахавальня. Артыкул. Там жа. С 336

104. Полацкія княжацкія палаты. Артыкул. Энцыклапедыя літа ратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. Мн.1987.Т.5. С. 338 339

105. Тураўская царква. Артыкул. Там жа С 289

106. Цамянка. Артыкул. Там жа. С. 464. Сааўтар М.М.Цэйтліна.

107. Новыя знаходкі ў Старым Замку [ Гродна: Археал. раскопкі]. Артыкул. Беларусь, 1987, N12. Сааўтар Ткачоў М.

108. Металічныя вырабы з раскопак Лідскага і Мірскага замкаў (XIV-XVIII стст.) Артыкул. Весці АН БССР. Сер. грамад. навук, 1987, № 4. с. 73-83. Сааутары Краўцэвіч А.К., Сагановіч Г.М.

109. Горад на Чачоры: [рэц. на кн.: Жаровіна Г.П.,Чарняўскі І. М., Дзімура І.В. Помнікі Чачэрска. Мн., 1985]. Рэцэнзія Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1987, № 3. С. 45.

110. Ахоўнай зоне — сілу закона. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1987, № 4. 1987. С. 28-29. Сааўтар Собаль В.

111. Яшчэ адзін помнік XII стагоддзя [Сцяна на Старым замку: Гродна] Артыкул. Голас Радзімы, 1987. 9 ліпеня. С. 8

112. Изучкение Старого замка в Гродно. Артыкул. Археологические открытия 1985 года. М., 1987. с. 468-469.

113. Музей-аптэка ў Гродне [З міжрэсп. навук.-практ. канф Гісторыя матэрыялізму і медыцыны ў Беларусі”] Артыкул. Літ. і мастацтва, 1987, 27 лютага С. 14.

114. Мураваная варта (Рэц.на кн.: Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн.,1987,]. Рэцэнзія. Літ. і мастацтва, 1987, 23 кастр. С. 6-7.

115. Вклад И.М.Хозерова в изучение полоцкого древнего зодчества. Артыкул. История и археология Полоцка и Полоцкой земли: К 1125-летию Полоцка: Конф. Полоцк, 1987. С. 69-70.

116. Чачэрская мінуўшчына (Рэц.на кн.: Жаровіна Г.П., Чарняўскі І.М., Дзімура І.В. Помнікі Чачэрска. Мн., 1985.]. Рэцэнзія. Літ. і мастацтва, 1987, 3 ліпеня. С. 7.

117. Несмяротнасць філасофскай думкі [Рец. на кн.: Прокшина Е.С., Шалькевича В.Ф. Казимир Лыщинский. Мн.,1986.]. Рэцэнзія. Голас Радзімы, 1987, 22 студзеня. С. 6-7.

118. Вопросы методики реставрации дворцово-паркового комплекса в г.п. Мир. Артыкул. Охрана и реставрация комплексных памятников Рига, 1987. С. 4-6. Сааўтары Бубновский Д., Чернявский И.

119. Работы в Лидском замке и Окольном городе древнего Мстиславля. Артыкул. Археологические открытия 1985 года. М., 1987. С. 469-470.

120. Изучение замка в Гродненской области. Артыкул. Археологические открытия 1985 года М., 1987. С. 466-468.

121. Лідскі замак, XIV ст. Артыкул. Мастацтва Беларусі, 1987, № 1. С. 47-48.

122. Графіка даўніх муроў. З гісторыі буд.тэхнікі ў манумент, дойлідстве Беларусі эпохі феадалізму. Артыкул. Мастацтва Беларусі, 1987, № 3. 59-64.

### *1988 год*

123. Лідскі замак. Артыкул. Францыск Скарына і яго час. Энцыкл. давед. Мн. 1988. С. 396. Сааўтар С.Г. Багласаў.

124. Мастацтва Беларусі ў 15-16 стст. Артыкул. Там жа. с. 408-414. Сааўтары Н.Ф. Высоцкая, Н.І. Здановіч, Л.У. Калядзінскі, А.К. Лявонава, ГА. Маслыка, В.Е. Собаль, М.М. Яніцкая.

125. Полацкі княжацкі храм. Артыкул. Там жа. С. 456-457.

126. Полацкі храм-пахавальня. Артыкул. Там жа. С. 457.

127. Полацкія княжацкія палаты. Артыкул. Там жа. С. 457.

128. Забудова вуліцы Герцэна. Артыкул. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Мінск. Мн.1988. С. 68-70. Сааўтары А.Ю. Петросава, У.М. Дзянісаў.

129. Забудова вуліцы Інтэрнацыянальнай. Артыкул. Там жа. С. 81-83. Сааўтары В.Н. Баскова, А.М. Кулагін, А.Ю. Петросава, І.М. Чарняўскі.

130. Багацце, створанае народам (Рэц. на кн.: Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т.Т.1. Ад старажытных часоў да - другой паловы XVI стагоддзя /Рэд.тома С.В.Марцэлеў, Л.М. Дробаў. Мн.,1987.). Рэцэнзія. Мастацтва Беларусі, 1988, N 2. С. 72-74.

131. Мураваны летапіс Полацка [Рэц.на кн.: Слюченко В.Г. Архитектурные памятники ГІолоцка: Ист.-архит. очерк. Мн.,1988). Рэцэнзія. ЛІМ ,1988, №46. 18 лістапада. С. 6-7.

132. Напішам радавод? Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1988, N2. С. 42-43.

133. Сравнительный анализ строительной техники черниговского, полоцкого (витебского) и гродненского монументального зодчества. Артыкул. Чернигов и его округа в IX-XIII вв.: Историко- археологический семинар: Тез. докл. Чернигов, 1988. С. 44-46.

134. Даследчык полацкага дойлідства [Пра І. Хозерава|. Артыкул. Голас Радзімы, №19. 12 мая. С. 8.

135. [Рэц.на кн.: Грицкевич В.П. С факелом Гиппократа: Из истории белорус, медицины. Мн.,1987.]. Рэцэнзія. Голас Радзімы, № 35. 1 верасня. С. 8.

136. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI-XVII вв. Архит.-археол. анализ. Манаграфія Мн. Наука и техника, 1988 157 с.

137. Вытокі беларускага фаянсу. Артыкул, Мастацтва Беларусі, 1988, N 6. С. 58-61. Сааўтары Ганецкая І., Здановіч Н.

138. Словарь зодчего: Изразцы муравленые, ценинные.

Артыкул. Строительство и архитектура Белоруссии, 1988, N1. С. 4L

139. Двери и их атрибуты. Артыкул. Строительство и архитектура Белоруссии, 1988, № 3. С. 32-36.

140. Памятник древнерусского зодчества в гродненском детинце. Артыкул. Памятники культуры: Новые открытия,- 1987 М.,1988. С. 461-467. Сааўтары Большаков Л.Н., Раппопорт П. А., Ткачев М.А.

141. Исторические и архитектурно-археологические исследования Кревского замка. Артыкул. Вопросы архитектуры Литовской ССР, 1988, Кн. 9(1).— (История архи тектуры.) С. 15-16. Сааўтар Ткачёв М.А.

142. Выйсце - карэнная перабудова [Аб задачах беларус, добра-ахвот. т-ва аховы помнікаў гісторыі і культуры). Артыкул Чырв. змена, 28 верасня. С. 5. Сааўтар І.Чарняўскі.

143. Сведкі мінуўшчыны, сведкі гісторыі... [Аб мурав. і землян. замках XIV-XVII ст. у рэсп.] Артыкул. Бярозка, №9. С. 24-25.

144. Экскурсія ў XVIII стагоддзе. Артыкул. Святло Кастрычніка.

### *1989 год*

145. Сацыяльна-гістарычныя ўмовы ўзнікнення Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 года (раздзел: Мастацтва). Артыкул. Статут Вялікага Княства Літоўскага1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн.,1989. С. 18-23. Сааўтары Н.І. Здановіч, А.К. Лявонава, В.Е. Собаль, М.М. Яніцкая.

146. Дахоўка. Артыкул. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн. 1989. С. 168.

147. Кафля. Артыкул. Там жа. С. 255-257. Сааўтар У.В. Угрыновіч.

148. Магілёўская кераміка. Артыкул. Там жа. С. 302. Сааўтар Н.І. Здановіч.

149. Мсціслаўская кераміка. Артыкул. Там жа. С. 325-326. Сааўтар Н І. Здановіч

150. Беларуская кафля. Альбом. Мн. 1989. 159 стар. 210 іл. Сааўтары В.А.Собаль, М.А.Ткачоў, У.В.Угрыновіч.

151. Изразцовые печи из лошицкой усадьбы. Артыкул. Строительство и архитектура Белоруссии 1989 N6. С. 36-39.

152. Як выйсці з прарыву (Аб ахове помнікаў бел. культуры). Артыкул. Чырв. змена, 1989, 24 чэрв. С. 8-9.

153. Мсціслаўская кастарэзная майстэрня. Артыкул. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі, 1989, N1. С. 18-19.

154. Тыпалогія і храналогія лідскай кафлі. Артыкул. Помнікі мастацкай культуры Беларусі:— Новыя дослед. Мн.,1989. С. 194-202. Сааўтар Угрыновіч У.В.

155. Эпоха Адраджэння на Беларусі. Наст, газета, 1989, 8 ліпеня.

156. Гродзенскі Стары замак. Артыкул. Мастацтва Беларусі, 1989 N 6. С. 47-48. Сааўтары Бачкоў У., Баравы Р.

157. Ці ўсё мы ведаем пра Магілёў?: [Рэц. на кн.: Мелешко В. И. Могилёв в XVI- середине XVII В.МН.1988J. Рэцэнзія. Полымя, 1989, N11. С. 203-205.

158. Кафля старажытнага Гродна [Па матэрыялах археал. Раскопак]. Артыкул. Голас Радзімы, №6. 9 лютага. С 8. Сааўтар А. Краўцэвіч.

159. Почему только „билингвизм”? Артыкул. Коммунист Белоруссии, 1989, N5. С. 15.

160. Дрыготкія водбліскі даўніны. Мсцісл. шкло канца XVI — першай паловы XVIII стст. Артыкул. Мастацтва Беларусі, 1989, N 4. С. 64-69. Сааўтар Сташкевіч А.

161. Кафля з замкавага двара (Крэўскі замак). Артыкул. Чырв. змена, 1989, 13 мая. С. 8-9.

162. Ці ажывуць „мураваныя летапісы” [Аб адраджэнні гіст.- культ. асяроддзя: Расказ нач. аддз. Комплекс. Навук. дослед. помнікаў ін-та „Белрэстаўрацыя”]. Артыкул. Настаўн. газета, 1989, 2 жніўня.

163. Раздзел „Литература, культура и исскусство”. Адзін з аўтараў раздзела. Артыкулы. Гродно. Энциклопедический справочник. Мн. 1969.

164. У старажытнай цагельні. Артыкул. Голас Радзімы. №51. 21 снежня. С. 8.

### *1990 год*

165. Ці будзе ў нас нацыянальная школа? Артыкул. Настаўн. газета, 1990, 22 снежня.

166. Старадаўніх муроў адраджэнне. Мінулае і сучаснасць Лідскага замка. Брашура. Мн. Полымя, 1990.

167. Мстиславские изразцы. Артыкул. Памятники культуры: Но вые открытия, 1989 М., 1990.

168. Сваю ношу - на чужыя плечы? (Аб становішчы з аховай помнікаў гісторыі і культуры ў рэсп.: Водгук на зварот парт. сходу ін-та гісторыі АН БССР). Артыкул. Звязда, 25 ліст. 1990. С. 2. Сааўтар Бубноўскі Д.

169. Старонкі мураванай кнігі. Манаграфія. Мн. Навука і тэхніка, 1990. 190 с.

170. Манеты з Крычава і Мсціслаўля. Артыкул. Спадчына, 1990 N4. С. 70-71. Сааўтар Ткачоў М.

171. Чарнобыль і наша гістарычная спадчына. Артыкул Спадчына, 1990, N3. С. 2-3.

